СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 4.41, 21.34, 16.53;
Віцебск — 4.23, 21.32, 17.09;
Магілёў — 4.31, 21.23, 16.52;
Гомель — 4.36, 21.13, 16.37;
Гродна — 4.57, 21.49, 16.52;
Брэст — 5.07, 21.40, 16.33.

МЕСЯЦ:
Маладзік 1 чэрвеня.

ІМЯНІНЫ:
Ефрасінні, Міхаіла, Ігната, Якуба, Дзмітрыя, Пятра, Івана, Андрэя, Генадзя.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

5 ЧЭРВЕНЯ 1992 г.
пятніца, № 112 (21890)

ВОЗГАЛАС

ЁСЦЬ ПОПЫТ НА ЎСЕ, НАВАТ НА БАМБАСХОВІШЧЫ

Нерухомасць і сродак хуткага руху — аўтамабіль сталі галоўнымі прадметамі цікавасці на праведзеным 2 чэрвеня чарговым мінскім аўкцыёне. Яго арганізатар, Кастрычніцкі райвыканком сталіцы такім чынам атрымаў прыбытак каля 3 мільёнаў рублёў, якія папоўняць рахунак дабрачыннага фонду «Надзея». Гэтыя сродкі будуць выдаткаваны на падтрымку бедных грамадзян, закладку жылога дома для інвалідаў з усімі неабходнымі службамі і г. д.

Багатыя пакупнікі выкладвалі наступныя сумы: трохпакаёвая кватэра — 1 млн. 650 тысяч (стартавая цана — 350 тысяч), «Жыгулі»-чацвёрка — 450 тысяч (стартавая цана — 300 тысяч), месца для гаража — 50 тысяч, месца для гандлёвага кіёска на Прывакзальнай плошчы — ад 40 да 49 тысяч, пяцігадовая арэнда памяшкання пад офіс — 360 тысяч, арэнда бамбасховішча 110 тысяч. Пытанне, што там можна рабіць, прадпрымальныя людзі вырашаюць арыгінальна: адкрыць кафэ, вырошчваць грыбы...

Сустрэчы ў МЗС Беларусі

Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Пётр Краўчанка запрасіў для гутарак кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў: Францыі — Клода Жаліфа, Кітая — Ван Сінда і Генеральнага консула Польшчы Эльжбету Смулэк.

У час сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Французскай Рэспублікі ў Беларусі Клодам Жаліфам абмяркоўваліся пытанні двухбаковых адносін. Былі закрануты некаторыя аспекты супрацоўніцтва паміж міністэрствамі замежных спраў і правядзення кансультацый па ядзернаму раззбраенню, праблемах эканамічнага развіцця. Бакі пацвердзілі гатоўнасць развіваць культурныя кантакты. У прыватнасці, ужо ў бліжэйшы час прадугледжваецца абмен тэатральнымі пастаноўкамі, адкрыццё кафедры беларускай мовы ў адной з ВНУ Францыі.

***

Пётр Краўчанка і Генеральны Консул Рэспублікі Польшча ў Мінску Эльжбета Смулэк абмяняліся інфармацыяй аб палітычнай сітуацыі ў абедзвюх краінах. У ходзе гутаркі абмяркоўваліся некаторыя аспекты маючага адбыцца візіту Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслава Шушкевіча ў Рэспубліку Польшча.

Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства закрануў пытанні, звязаныя з адкрыццём Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве. Было адзначана, што пры абмене дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўніцтвамі з Польшчай Беларусь будзе прытрымлівацца прынцыпаў узаемнасці.

Аддзел інфармацыі МЗС Рэспублікі Беларусь — БЕЛТА.

У Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Пасля прызнання паўнамоцтваў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь на першай сесіі Вярхоўнага Савета дванаццатага склікання, якая адбылася ў маі 1990 года, нашы парламентарыі пачалі наладжваць кантакты з парламентамі і няўрадавымі арганізацыямі замежных дзяржаў. Беларусь стала ўваходзіць у цывілізаваны свет. І гэта натуральна.

Адны народныя дэпутаты вывучалі заваёвы рынкавай эканомікі ў Федэратыўнай Рэспубліцы Германіі, практыку прыватызацыі жылля ў Рэспубліцы Польшча, удзельнічалі ў перагаворах з замежжам аб арганізацыі адпачынку дзяцей з забруджаных радыенуклідамі раёнаў Беларусі, вялі дзелавыя перамовы з прадстаўнікамі фірм Вялікабрытаніі. Другія абмяркоўвалі пытанні вялікай эканомікі, гуманітарнай палітыкі, культуры, вывучалі вопыт парламенцкай дзейнасці, па запрашэнню дзяржаўных і грамадскіх арганізацый замежных краін прымалі ўдзел у міжнародных форумах.

Вынікі гэтай работы, яе плён былі абмеркаваны на чарговым пасяджэнні Прэзідыума Вярхоўнага Савета, якое праходзіла пад старшынствам Станіслава Шушкевіча. Быў таксама разгледжаны план супрацоўніцтва Вярхоўнага Савета рэспублікі з парламентамі іншых дзяржаў на бліжэйшую перспектыву. І хоць ён будзе дапрацаваны, але ўжо відавочна, што найбольш значнае месца ў ім адводзіцца вывучэнню заканадаўстваў заходнееўрапейскіх і іншых краін свету аб праве ўласнасці на зямлю, прыватызацыю дзяржаўнай уласнасці, ажыццяўленню сацыяльнай абароненасці грамадзян.

Будуць вывучацца таксама замежны вопыт і практыка заканатворчай дзейнасці па пытаннях, звязаных з рэгуляваннем міжнацыянальных адносін і ажыццяўленнем нацыянальнай палітыкі, экалагічным становішчам увогуле і мнагамэтавай абароненасцю насельніцтва, пражываючага ў мясцовасці, жыхары якой пацярпелі ў выніку аварыі на ЧАЭС, і іншых.

У сувязі з падпісаннем у Ташкенце ў ходзе сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў СНД пагаднення аб прынцыпах і парадку выканання дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе (ЗУСЕ) узнікла неабходнасць ратыфікацыі гэтага пагаднення адначасова з дагаворам аб ЗУСЕ беларускім парламентам. Прэзідыум прыняў рашэнне пытанне аб ратыфікацыі гэтых двух дакументаў вынесці на чарговую сесію Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Вырашаны некаторыя кадравыя пытанні.

Намеснікамі старшыні Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь зацверджаны Мікалай Пятровіч Корбут, Васіль Барысавіч Даўгалёў, Вячаслаў Іванавіч Радомскі.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета назначыў надзвычайнымі і паўнамоцнымі паслямі Пятра Вікенцьевіча Садоўскага ў Федэратыўнай Рэспубліцы Германіі і Уладзіміра Лявонавіча Сянько ў Рэспубліцы Польшча. Ім прысвоены дыпламатычны ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла.

На пасяджэнні Прэзідыума былі разгледжаны і іншыя пытанні жыцця рэспублікі.

М. БАБРОЎКА,
прэс-служба Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. (БЕЛТА).

І ЗНОЎ РАЗУМАЎ

ОРША. **(Мікалай ПЯТРОЎ, кар. БелаПАН).** Калектыў работнікаў пракуратуры горада Оршы выступіў у абарону свайго калегі Сяргея Дунца, звярнуўшыся з заявай на імя Генеральнага пракурора рэспублікі.

Нагадваем, Сяргей Дунец быў вызвалены з пасады намеснікам пракурора Оршы рашэннем калегіі абласной пракуратуры. Сам апальны абаронца закона тлумачыць свае непрыемнасці крытычнымі выступленнямі ў адрас абласной пракуратуры, а таксама тым, што даў згоду быць на судзе сведкам па іску аб абароне гонару і годнасці вядомага прафсаюзнага дзеяча Мікалая Разумава. Нагадаем: раней, год назад, Разумаў абвінавачваўся ў арганізацыі блакады чыгункі ў Оршы, а затым гэта абвінавачванне з яго зняў Вярхоўны суд рэспублікі.

Скаўты жывуць дружна

Аб гэтым паведаміў нам скаўт-канцлер Аб'яднання беларускіх скаўтаў Аркадзь Жукоўскі, які прачытаўшы заметку аб рознагалоссях паміж яго арганізацыяй і Саюзам скаўтаў Беларусі, не згадзіўся з гэтым і запэўніў, што ў яго аб'яднанні нават ён не ведае, якой нацыянальнасці той ці іншы скаўт.

ГРАДЫЦЁФАКТ

Лабараторыя сацыялагічнага цэнтра ВДУ правяла даследаванне на тэму «Сацыяльны партрэт беларускага прадпрымальніка». Асяроддзе, з якога выйшлі прадпрымальнікі: былыя заводскія інжынеры, якім дзяржава раней недаплачвала, навукова - тэхнічная інтэлігенцыя, якая не магла рэалізаваць сваіх ідэй у дзяржаўным сектары, былыя кіраўнікі з добрымі сувязямі і былыя «ценевікі».

Матэрыяльнае становішча прадпрымальнікаў: чатыры з палавінай працанты могуць дазволіць сабе усё, 50 працэнтаў — забяспечаны нармальна (аднак дачу ці машыну купіць зараз не могуць), 17 працантаў ледзьве зводзяць канцы з канцамі (пачынаючыя бізнесмены).

Цяжкасці: на першым месцы ў прадпрымальнікаў — адсутнасць прававой базы і юрыдычных гарантый.

Жыццёвыя каштоўнасці: на першым месцы—незалежнасць. Грошы толькі на трэцім.

Калі эканамічная рэформа праваліцца, каля 48,5 працэнта бізнесменаў будуць змагацца да канца; 18,8—пакінуць бізнес і вернуцца ў дзяржаўны сектар; 11 — на заробленыя грошы будуць марнатраўцамі жыцця; 10—паедуць за мяжу; 7 працэнтаў — зоймуцца «ценявым» бізнесам.

***

Гродзенскі абласны Савет прыняў рашэнне аб увядзенні з чэрвеня нарміраванага размеркавання нафтапрадуктаў для ўладальнікаў асабістага транспарту па лімітных картках. Аўтаматар мае права заліць у бакі сваёй машыны 80 літраў бензіну ў месяц. За парушэнне ўстаноўленага парадку і падробку картак—штраф ад 200 да 10 тысяч рублёў.

***

Вялікая кітайская і берлінская сцены вядомыя ўсім. Хутка іх спіс папоўніць яшчэ адна—бабруйская. Яе ўзводзяць у горадзе на Вярэзіне вакол дзіцячага сада-ясляў нумар 65. Вышыня сцяны каля 3м, а ў даўжыню яна дасягнула ўжо 100 метраў. Падлічана, што на яе будаўніцтва спатрэбіцца не менш як 100 тысяч рублёў. Прызначэнне сцяны: адгарадзіць прахожых ад тэрыторыі сада-ясляў. Пытанне: ці не лепш было б на гэтыя грошы набыць цацкі, а агароджу зрабіць менш манументальнай і больш таннай?

КРЫХУ КАРЭЙСКАГА ШАРМУ ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІКІ

Па запрашэнню ўрада Беларусі ў Мінску знаходзілася дэлегацыя паўднёвакарэйскай карпарацыі «Дэу». 2 чэрвеня гасцей прыняў Старшыня Савета Міністраў рэспублікі Вячаслаў Кебіч.

— Дасягнутыя тут дагаворанасці пераўзышлі нашы чаканні, — сказаў кіраўнік дэлегацыі старшыня карпарацыі «Дэу» Кім Ву Чунг. — Мы нанава адкрылі для сябе Беларусь, вызвалі інтэлектуальны патэнцыял і вытворчасці, здольныя канкурыраваць на сусветным рынку. Мы неадкладна пачынаем стварэнне сумесных прадпрыемстваў па выпуску высакакласнай радыёэлектроннай тэхнікі, электрабытавых прыбораў, тавараў народнага спажывання.

Пасля завяршэння сустрэчы кіраўнік урада рэспублікі Вячаслаў Кебіч даў эксклюзіўнае інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА:

— Мне вельмі падабаецца, што з Паўднёвай Карэяй устанаўліваюцца цесныя дзелавыя адносіны. Гэта прамы вынік нядаўняй паездкі нашай урадавай дэлегацыі ў Сеул. Тады ж мы пабывалі і на прадпрыемствах карпарацыі «Дэу».

Пазней «Дэу» прыслала да нас сваіх спецыялістаў, якія вывучылі магчымасці нашай прамысловасці. А цяпер у Мінск прыехалі кіраўнікі карпарацыі, каб заключыць кантракты. Толькі што мы падпісалі рад дакументаў. З іх вынікае, напрыклад, што фірма «Мілавіца» ў хуткім часе будзе пераабсталёўвана навейшым абсталяваннем, пасля чаго ў два разы павялічыць аб'ём сваёй прадукцыі, якая карыстаецца, нават я чуў, велізарным попытам у жанчын. Палавіну выпускаемых «Мілавіцай» звышпланавых вырабаў «Дэу» возьме сабе. Гэта і будзе разлік за пастаўленую тэхналогію.

Вельмі зацікавіў фірмачоў «Інтэграл». Дзесяць спецыялістаў гэтага прадпрыемства пройдуць за кошт «Дэу» стажыроўку ў Карэі. Такую ж увагу карэйцы ўдзялілі НДІ ЭВМ, дзе заключылі кантракт на сумесную распрацоўку камп'ютэраў. Прычым дагаварыліся, што выпуск вырабаў будзе наладжаны на сусветным узроўні і збыт застаецца за «Дэу». Матарнаму заводу карпарацыя прапануе супрацоўніцтва ў вырабе складаных вузлоў для рухавікоў. А ў трактарнага і аўтамабільнага заводаў мае намер закупляць асобную гатовую прадукцыю.

Я высока ацэньваю перспектывы супрацоўніцтва з карпарацыяй «Дэу». Яны ўнушаюць аптымізм. Нашы прадпрыемствы атрымаюць выхад на якасна новы тэхналагічны ўзровень, а рэспубліканскі бюджэт папоўніцца валютай, неабходнай для рэфарміравання эканомікі ў цэлым.

Валянціна МЕНШЫКАВА, кар. БЕЛТА.

Урад шукае выхад з крызісу

Як паведамлялася ўжо ў друку, Прэзідыум Савета Міністраў Беларусі разгледзеў і адобрыў асноўныя напрамкі палітыкі ўрада рэспублікі па прадухіленню спаду вытворчасці і фарміраванню ўмоў выхаду з крызісу. Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязей Савета Міністраў прадаставіла БЕЛТА матэрыял аб гэтых асноўных напрамках. У ім вызначаны мэты і акрэслены шляхі іх дасягнення. Падрыхтаваны і максімальна канкрэтызаваны рабочы план, у якім вызначаны дакладныя даты і выканаўцы намечаных да вырашэння праблем.

Аналіз сённяшняй абстаноўкі і прагноз далейшага развіцця сацыяльна - эканамічнай сітуацыі ў 1992 годзе дазваляюць зрабіць вывад аб тым, што цяпер эканоміка рэспублікі падышла да новага этапу эканамічнага крызісу. Нарастае спад вытворчасці, які непазбежна суправаджаецца разбурэннем грашовай, крэдытнай і фінансавай сістэм, стагнацыяй і зніжэннем узроўню жыцця народа, магчымым беспрацоўем. Другая асаблівасць гэтага этапу — шокавая лібералізацыя цэн, не праводзіць якую ўслед за Расіяй практычна немагчыма. Занадта вялікая залежнасць нашай рэспублікі ад расійскай сыравіннай і паліўна-энергетычнай базы, а таксама грашовай і цэнавай палітыкі ўрада Расіі.

Хваробы вядомыя, усе яны ў наяўнасці і пагражаюць эканоміцы рэспублікі, а насельніцтву зніжэннем жыццёвага ўзроўню. Акрамя таго ўзнікла рэальная перспектыва прыйсці да адмоўнага сальда ў гандлёвым балансе Беларусі з краінамі былога СССР.

Стратэгічны курс урада па пераадоленню крызісу заключаецца ў паслядоўным і больш паскораным фарміраванні рынкавай эканомікі з адначасовай глыбокай структурнай перабудовай народнагаспадарчага комплексу рэспублікі. Ён прадугледжвае разумнае згортванне рэсурсаёмістых вытворчасцей (у першую чаргу тых, якія вызначаюць адмоўныя гандлёвыя плацёжныя балансы рэспублікі з краінамі СНД) і інтэнсіўнае развіццё навукаёмістых вытворчасцей, што забяспечваюць рост экспартнага патэнцыялу і задавальненне патрэбнасцей самой рэспублікі. Разам з гэтым урад будзе мэтанакіравана праводзіць у жыццё тактыку эканамічных прарываў у тых сферах і галінах, дзе яны рэальна магчымыя і ў стане даць адносна хуткі эфект. Гэта сельская гаспадарка, вытворчасць тавараў народнага спажывання, канверсія той часткі ВПК, якая можа хутка пачаць вытворчасць тавараў для насельніцтва і абсталявання для галін групы «Б».

Для гэтага неабходна зняць абмежаванні на ўстанаўленне прамых камерцыйных сувязей паміж прадпрыемствамі і іншымі вытворцамі прадукцыі і паслуг нашай рэспублікі і іншых краін (акрамя ліцэнзуемай прадукцыі), а таксама абмежаванні на стварэнне сумесных прадпрыемстваў і інвесціраванне замежнага капіталу ў эканоміку рэспублікі.

Прадугледжана стварыць адзіны камерцыйны рэспубліканскі фонд бартэрных здзелак і камерцыі, права карыстання якім павінны атрымаць усе вытворцы, якія маюць заказы на экспартную прадукцыю, а таксама выпускаюць тавары народнага спажывання і сродкі вытворчасці для тэхнічнага пераўзбраення асабліва патрэбных рэспубліцы прадпрыемстваў, расшырыць круг дзейнасці дзяржаўных знешнеэканамічных органаў і рэзка павысіць яе эфектыўнасць. Пры гэтым асаблівая ўвага павінна быць удзелена расшырэнню нашай прысутнасці на рынках Усходняй і Заходняй Еўропы, Сярэдняга і Блізкага Усходу. А галоўнай задачай павінна стаць пераадоленне дыктату манапалістаў — пастаўшчыкоў сыравінных і матэрыяльна - тэхнічных рэсурсаў.

Намечана ўвесці заявачны прынцып стварэння новых недзяржаўных вытворчых прадпрыемстваў, выслабаніўшы іх як мінімум на два гады ад усіх падаткаў. Трэба будзе вывучыць магчымасць і мэтазгоднасць здачы ў канцэсію замежным фірмам асобных зямельных участкаў для правядзення на іх геолага - разведачных работ, арганізацыі здабычы і перапрацоўкі карысных выкапняў. Прызнана неабходным стварыць дзяржаўна - камерцыйны зямельны (іпатэчны) банк, надзяліўшы яго правам уласнасці на частку зямельнага фонду рэспублікі, продажу зямлі і выдачы пад залог ільготных доўгатэрміновых крэдытаў на набыццё неабходных матэрыяльна - тэхнічных рэсурсаў, а таксама адшукаць магчымасць атрымання за рубяжом мэтавага крэдыту (парадку 1,5—2 млрд. долараў) на стварэнне магутнасцей па выпуску і на набыццё сродкаў вытворчасці для фермерскіх гаспадарак.

Ваенна - прамысловаму комплексу трэба будзе самому навучыцца зарабляць дадатковыя сродкі на канверсію за кошт новых і тэрміновых мірных заказаў. А дзяржаўныя капітальныя ўкладанні вырашана пераважна накіроўваць на развіццё інфраструктуры рэспублікі, прапрацаваўшы пры гэтым пытанне аб выкарыстанні часткі дзяржаўных сродкаў для ўзвядзення жылля ў вёсцы жыхарам гарадоў, якія пажадалі пераехаць туды і заняцца сельскагаспадарчай вытворчасцю.

Неабходна таксама стварыць не менш двух-трох свабодных эканамічных зон.

Адна з важнейшых мэт структурнай перабудовы эканомікі рэспублікі — стварэнне ў ёй канкурэнтнага асяроддзя, якое неабходна для эфектыўнага выкарыстання рынкавых механізмаў кіравання вытворчасцю на аснове разумнага разбуйнення існуючых вытворчых аб'яднанняў і іншых прадпрыемстваў, асацыяцый і арганізацый, а таксама ўмоў для паскоранага развіцця недзяржаўнага сектара эканомікі, прадстаўленага ў асноўным малым і сярэднім бізнесам.

Каб аслабіць эканамічную залежнасць ад іншых дзяржаў, неабходна распрацаваць спецыяльную праграму паляпшэння самазабеспячэння рэспублікі прадукцыяй, сыравінай і матэрыяламі за кошт расшырэння ўнутрырэспубліканскай каапераціі, рэсурсазберажэння, стварэння сумесных прадпрыемстваў у краінах СНД. Мяркуецца завяршыць перагляд заданняў рэспубліканскіх навукова - тэхнічных праграм, а таксама разгледзець на конкурснай аснове навукова - тэхнічныя праекты, забяспечыўшы найбольш поўную рэалізацыю адобраных прыярытэтаў навукова - тэхнічнага развіцця рэспублікі і максімальна выкарыстаўшы на гэтыя мэты сродкі, выдзяляемыя з рэспубліканскага бюджэту на 1992 год. Прадоўжыцца перабудова фінансавання навукі, пошук неадкладных мер для забеспячэння паўнацэннага развіцця народнай адукацыі, аховы здароўя, культуры. У адпаведнасці з законам аб прыватызацыі жылля ўрад намячае ажыццявіць жыллёвую рэформу, якая прадугледжвае гарманічнае спалучэнне інтарэсаў дзяржавы, тэрыторый і асобных грамадзян, плаўны пераход ад усеагульнага размеркавання жылля да рынку жылля, развіццё ўсіх форм яго ўласнасці.

У грашова - крэдытнай і фінансавай палітыцы ўрад намецію адначасова тры напрамкі: усямерная актывізацыя вытворчай дзейнасці з мэтай хутчэйшага пераадолення спаду вытворчасці, стварэнне ўласнай грашова-крэдытнай і фінансавай сістэмы, здольнай працаваць ў аўтаномным рэжыме, і жорсткая фінансавая палітыка ў галіне расходавання дзяржаўных сродкаў. У прыватнасці, прадугледжана адпрацаваць і абгрунтаваць праграму дасягнення частковай унутранай канверсуемасці валюты, прапрацаваць варыянт прыцягнення для гэтых мэт доўгатэрміновых замежных пазык у СКВ, вывучыць магчымасць, межы і спосабы выкарыстання раздзяржаўлення і прыватызацыі

(Заканчэнне на 2-й стар.).

НАРОДНЫ ЛЯЧЭБНІК

Айбаліт XVII стагоддзя

СА СТАРАЖЫТНАЙ ГАМЕАПАТЫІ

● ПРЫ ПРАСТУДЗЕ хвораму давалі піць раствор воцату з імбірам, пасля чаго ўкладвалі спаць, добра захутаўшы ў цёплыя звярыныя шкуры.

● **ПРЫ РЭЎМАТЫЗМЕ на спіну клеілі пярцовы пластыр. Перац, як і імбір, прывозілі з Індыі.**

● АНГІНУ лячылі так: «адкрывалі кроў» пад языком, а потым прымушалі пацыента паласкаць горла гарэлкай, настоенай на шафране, пялёстках ружы і іншых травах. Пры летніх ангінах абавязкова прыпісвалі хвораму кожны дзень есці чырвоныя парэчкі.

● **ПРЫ КАРЫЁЗЕ лекар закладваў у хворы зуб кветку гваздзікі.**

● ПРЫ МАЛАКРОЎІ назначалі лімоны (іх куплялі і ўжывалі ў ежу ў салёным выглядзе).

● **Мускатны арэх прымянялі як МАЧАГОННЫ СРОДАК.**

● ХВОРЫМ З ВЫСОКАЙ ТЭМПЕРАТУРАЙ «адкрывалі жыльную кроў», каб вывесці з арганізма жар. Пасля гэтай малапрыемнай працэдуры доктар (тэрапеўт) рэкамендаваў хвораму паесці юшкі са свежых акунёў і ракаў або смажанай рыбы, папярэдне паліўшы яе лімонным сокам. А вось рэдзьку і хрэн у гэтым выпадку есці было нельга.

● **ПРЫ ВОНКАВЫХ ПАШКОДЖАННЯХ** хірург **прыкладваў да хворага месца свежае лісце капусты, гарчыцы, арэшніку.**

● **ЯЗВЫ** прамывалі выцяжкамі цыбулі, часнаку, буракоў, хрэну.

● **У ГНОЙНУЮ РАНУ засыпалі тоўчаную бярозавую кару — і гной знікаў.**

● **ПРЫ САРДЭЧНЫХ ЗАХВОРВАННЯХ** пілі настойку ландышу.

● **ПРЫ АГУЛЬНЫМ АСЛАБЛЕННІ** арганізма **назначаўся адвар з лісця дзьмухаўца.**

● Каб выклікаць ПЕРАРАЗМЕРКАВАННЕ карысных і шкодных сокаў у арганізме, урач праколваў скуру хворага і закладваў у разрэз порцыю перцу з мыш'яком або сокам люціка. Нягледзячы на пакуты пацыента, такі «пластыр» не здымалі не працягу 40 дзён, пакуль сярознае выдзяленне не дасягне максімальных размераў.

● **Аматарам МАГІЧНЫХ ЗЕЛЛЯЎ прапаноўвалі тоўчаную косць адзінарога, прывезеную з Амстэрдама. Верылі, што гэта лепшы сродак пры атручэннях, воспе, ліхаманцы, а таксама з'яўляецца добрым пратагонным.**

● НЕ МЕНШУЮ РЭПУТАЦЫЮ меў «безуй» — камень, які знаходзіцца ў вантробах некаторых жывёлін. Яму прыпісавалася сіла проціяддзя.

● **З лякарстваў ЦАРСКАЙ АПТЭКІ асаблівым попытам карысталася «ракавая мазь». Яе рыхтавалі з масла, мяса рака, драўлянага алею і разнастайных спецый.**

● Самай папулярнай пры двары заставалася ГАРЭЛКА-АПАПЛЕТЬІКА. Бабы, мускатны арэх, карыца, перац, размарынавыя кветкі, шалфей, каранні півоні—усё гэта настойвалася на спірце ядлоўца і гуляфнай гарэлцы. На жаль, мы цяпер і не ведаем, што гэта. Канешне, гэтым лячылі розных арыстакратаў. Просты люд карыстаўся сродкамі больш сціплымі. Але вось што дзіўна: у Маскве XVII стагоддзя было ўсяго два віды аптэк: царская і для людзей «усялякіх чыноў». І хапала! Ні чэргаў, ні дэфіцыту лякарстваў. Праўда, горад быў тады меншы. І правіцелі лепшыя...

Газета «Хозяин» (Масква).

Гэты смачны ліст капусны

Капуста паказана людзям, хворым падаграй, вадзянкай, таму што яна валодае мачагоннымі ўласцівасцямі і выводзіць уратныя солі, нармалізуючы водна-солевы абмен. Здробненая свежая і кіслая капуста рэгулюе работу кішэчніка, узмацняе сакрэцыю страўнікавага соку, паляпшае стрававание. Заўважана, што свежая капуста, з'едзеная нанач, робіць сон больш глыбокім, заспакойвае нервовую сістэму.

Каб пахудзець, схільныя да атлусцення людзі карыстаюцца капуснай дыетай. Гэта правільна: татранавая кіслата, якая ўтрымліваецца ў ёй, нармалізуе тлушчавы абмен у арганізме, дапамагае падтрымаць малады, здаровы выгляд.

У народнай медыцыне часта карысталіся сокам свежай капусты.

Для ўмацавання арганізма яго давалі хворым на авітаміноз. А вясной наогул раілі піць сок і дарослым, і дзецям, апрача тых, канешне, каму капуста проціпаказана.

Як мачагоннае сок прымаюць па паўшлянкі тройчы на дзень на працягу тыдня. Добра ён дзейнічае пры гастрытах і паніжанай кіслотнасці, нават лечыць язву страўніка. Але пры павышанай кіслотнасці строга проціпаказаны.

Народныя лекары лічаць, што свежы капусны сок, змяшаны з цукрам, «разбівае макроту», «праганяе хрыпату», таму часта рэкамендуюць яго пры лячэнні кашлю. Пры ангіне сокам, разведзеным з вадой, палошчуць горла: ён валодае антысептычнымі ўласцівасцямі. Па той жа прычыне капусныя лісты прыкладваюць да запаленых і ацёкшых частак скуры. А гнойныя раны ачышчаюць так: свежыя лісты здрабняюць, змешваюць з яечным бялком і накладваюць на хворае месца. Таксама лечаць і апёкі, гнойныя язвы. Пры галаўным болі капусныя лісты прывязваюць у выглядзе кампрэса на лоб.

Зваранымі ў малацэ лістамі лячылі залатуху ў дзяцей: лісты здрабнялі і змешвалі з высеўкамі. З гэтай масы рабілі бліны і прыкладвалі да пашкоджанай скуры. Вульгарныя бародаўкі выводзілі капусным сокам на працягу дзесяці дзён. Іншы раз для гэтага карысталіся сокам сырой бульбы.

Лячыць і аздараўляць арганізм можна з дапамогай не толькі свежай капусты, але і кіслай. Яна дапамагае пры атэрасклерозе, выводзіць халестэрын, карысная пры атлусцені. Сок кіслай капусты танізуе кішэчнік, дапамагае пазбавіцца ад запораў: на шклянку соку дадаюць дзве сталовыя лыжкі алею.

Капуста — расліна жаночага роду. Магчыма таму ёй ёсць што прапанаваць жанчынам. Распараныя лісты прыкладваюць да малочнай залозы, калі ў маладой маці сочыцца малако. Такі кампрэс умацоўвае залозу, але не змяншае колькасці малака, што надзвычай важна. Калі ж малако ў залозе згушчаецца, таксама трэба пакласці капусны кампрэс.

У касметыцы прымяняюць маскі, у якія ўваходзіць капуста. Для сухой скуры з пігментнымі плямамі: змазаць твар алеем, потым накласці «капусную кашу». Для тлустай: здробненую кіслую капусту нанесці на твар, праз дваццаць хвілін зняць і змазаць твар крэмам.

Калі валасы тонкія і сякуцца, капусны сок, разведзены папалам з сокам шпінату, умацуе іх і надасць прыемны бляск: ім змазваюць скуру галавы.

Урад шукае выхад з крызісу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

дзяржаўнай маёмасці замежнымі грамадзянамі (у першую чаргу інвестарамі) для хутчэйшага дасягнення частковай канверсуемасці грошай, правесці пераацэнку ўсяго нацыянальнага набытку Беларусі па сусветных цэнах (у доларах), удасканаліць існуючыя сістэмы пенаўтварэння і аплаты працы.

Трэба будзе ўдасканаліць таксама падатковую сістэму, у якой па сутнасці адсутнічаюць падаткова-плацежныя стымулы для развіцця прадпрымальніцтва, прагрэсіўных рыначных форм і структур малога бізнесу, арэнды, акцыяніравання, біржавой дзейнасці. У сувязі з гэтым, паводле вынікаў работы за першае паўгоддзе 1992 г., урад мае намер падрыхтаваць пакет прапаноў па ўнясенню змяненняў у падатковае заканадаўства.

Працэс стабілізацыі эканомікі і яе рыначнага рэфарміравання патрабуе ўсямернай актывізацыі працэсаў раздзяржаўлення і прыватызацыі, якімі намячаецца ахапіць усе сферы эканомікі. У гэтай частцы прымаемых мер палітыка ўрада адназначная: пачынаць на ўсіх «франтах» адразу і на аснове разнастайнасці форм прыватызацыі рашуча абмежаваць умяшанне дзяржавы ў арганізацыю і кіраванне вытворчасцю на камерцыялізаваных прадпрыемствах, павысіць адказнасць працоўных калектываў за сваю дзейнасць шляхам іх пераводу на жорсткі рэжым самафінансавання. У сваю чаргу для павышэння эфектыўнасці і паскарэння тэмпаў прыватызацыі неабходна надзяліць Дзяржмаёмасць Рэспублікі Беларусь і яе мясцовыя органы больш шырокім кругам паўнамоцтваў, перадаўшы ў іх распараджэнне ўласнасць дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый і права канчатковага вырашэння пытанняў аб тэрмінах і формах прыватызацыі, скараціць гранічныя тэрміны разгляду заявак, якія паступілі ад працоўных калектываў і асобных грамадзян, скараціць пералік прадпрыемстваў, арганізацый і відаў маёмасці, у адносінах да якіх цяпер не дапускаецца або абмяжоўваецца прыватызацыя.

У мэтах больш шырокага прыцягнення замежнага капіталу для прыватызацыі дзяржмаёмасці прызнана мэтазгодным зняць цяпер дзеючыя абмежаванні па стварэнню ў Беларусі замежных банкаў і зрабіць больш надзейнай абарону капіталаў зарубежных інвестараў.

Недзяржаўнаму сектару эканомікі прадугледжана прадаставіць максімум свабод пры вызначэнні структуры і відаў вытворча - гаспадарчай дзейнасці, выкарыстанні прыбытку, які застасецца ў яго распараджэнні. Павінна быць створана таксама эфектыўная сістэма прававой абароны прыватнай уласнасці. Для забеспячэння паскоранага развіцця прадпрымальніцтва ў цэлым неабходна ў бліжэйшы час завяршыць распрацоўку спецыяльнай праграмы яго дзяржаўнай падтрымкі і развіцця.

Знешнеэканамічную дзейнасць рэспублікі ўрад мае намер будаваць на прынцыпах выбарчага пратэкцыянізму, з улікам і ў цеснай сувязі з праводзімымі мерамі па рэфарміраванню эканомікі, на якасна новай тэхналагічнай аснове і стабілізацыі валютна-грашовай сістэмы.

Для расшырэння знешняга гандлю і ўзмацнення зацікаўленасці прадпрыемстваў-экспарцёраў у нарошчванні аб'ёмаў экспартных паставак, лічаць у Савеце Міністраў, неабходна адмяніць падаткі і таможныя пошліны на экспарт усіх відаў тавараў і паслуг, стварыць найбольш спрыяльны рэжым гаспадарання для прадпрыемстваў, якія вырабляюць на экспарт тавары і паслугі з замежным удзелам, адмяніць усе экспартныя квоты і экспартныя ліцэнзіі, за выключэннем строга абмежаванага спіса тавараў.

Эфектыўнасць валютнага рынку трэба будзе павысіць за кошт далейшай лібералізацыі знешнегандлёвых і валютных аперацый, увядзення стымулюючага падаткаабкладання валютных даходаў прадпрымальніцкіх структур, а таксама істотнага змякчэння заканадаўства ў галіне прыцягнення ў рэспубліку замежных інвестараў. Неабходна расшырыць круг банкаў, упаўнаважаных праводзіць валютныя аўкцыёны, адкрыць пункты па абмену валюты, на ўсёй тэрыторыі рэспублікі, паслядоўна праводзіць курс на забеспячэнне валютнай самаакупнасці і валютнага самафінансавання прадпрыемстваў вытворчай сферы, увесці гандлёвыя і плацежныя балансы Беларусі ў свабодна канверсуемай валюце ў адносінах да розных абменных курсаў. Для забеспячэння паскоранага развіцця і павышэння эфектыўнасці знешнеэканамічнай дзейнасці трэба ў самы бліжэйшы час адпрацаваць і ўвесці ў дзеянне цэласную сістэму экспартна - імпартнага крэдытавання, у тым ліку і льготнага. А таксама павысіць ролю Белзнешэканомбанка ў развіцці факторынгавага абслугоўвання экспарцёраў.

Улічваючы эканамічную сітуацыю, якая складваецца ў рамках СНД, Рэспубліка Беларусь будзе будаваць свае эканамічныя адносіны з іншымі членамі Садружнасці такім чынам, каб з аднаго боку ўсямерна расшыраць рэальныя магчымасці для абароны свайго эканамічнага і палітычнага суверэнітэту, дабівацца больш хуткай і поўнай рэалізацыі сваіх уласных эканамічных і сацыяльных інтарэсаў, а з другога — не ствараць прадпасылак і не даваць падстаў для абвастрэння супярэчнасцей паміж дзяржавамі Садружнасці.

Пры ажыццяўленні інтэграцыі Рэспублікі Беларусь у сусветную эканоміку, на думку ўрада, неабходна ў самы бліжэйшы час забяспечыць распрацоўку і ўкараненне прынцыпова новай сістэмы інфармацыйнага забеспячэння развіцця рэспубліканскай эканомікі, што базіруецца на сістэме нацыянальных рахункаў, якая ўзята «на ўзбраенне» большасцю цывілізаваных краін свету.

Зразумела, усе гэтыя меры запатрабуюць падрыхтоўкі сваіх і запрашэння высокакваліфікаваных замежных спецыялістаў для аказання рэспубліцы неабходнай тэхнічнай дапамогі ў наладжванні рыначных механізмаў кіравання эканомікай. Наконт гэтага таксама ёсць канкрэтны план дзеянняў.

У цэлым «рэцэпты», прапануемыя ўрадам, носяць сацыяльную накіраванасць і зарыентаваны ў першую чаргу на інтарэсы насельніцтва і народнай гаспадаркі Беларусі. Яны прадугледжваюць развіццё прыватнай ініцыятывы і прадпрымальніцтва пры адначасовым узмацненні і павышэнні эфектыўнасці і аператыўнасці дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Цэнтральнае месца ў ім павінны заняць антыманапольныя меры, рэгуляванне з дапамогай эканамічных рычагоў. Але будзе распрацаваны і праект заканадаўчага акта аб узмацненні выканаўчай улады на месцах, дзе нярэдка ўносяць непатрэбную сумятню ў рашэнні, прымаемыя на рэспубліканскім узроўні. Савет Міністраў лічыць таксама мэтазгодным пасля прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь перапрацаваць генеральную схему кіравання народнай гаспадаркай, прывёўшы яе ў адпаведнасць з прынятай сістэмай дзяржаўнай будовы рэспублікі.

(БЕЛТА).

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

АБ ДАДАТКОВЫХ МЕРАХ ПА САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ ПЕНСІЯНЕРАЎ, ІНВАЛІДАЎ І ІНШЫХ ГРУП НАСЕЛЬНІЦТВА

З мэтай узмацнення сацыяльнай абароны пенсіянераў, інвалідаў, ветэранаў вайны і працы, іншых груп насельніцтва рэспублікі ў сувязі з лібералізацыяй цэн і павышэннем тарыфаў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Павялічыць з 1 чэрвеня 1992 г. штогадовую грашовую кампенсацыю расходаў на транспартнае абслугоўванне, што выплачваецца інвалідам Айчыннай вайны I групы, не маючым права па медыцынскіх паказчыках на забеспячэнне бясплатна легкавым аўтамабілем «Запарожац», а таксама інвалідам Айчыннай вайны, маючым права па медыцынскіх паказчыках на атрыманне бясплатна аўтамабіля «Запарожац», але не атрымаўшым яго ці купіўшым аўтамабіль іншай маркі без уліку кошту належнага бясплатна аўтамабіля «Запарожац», з 2.400 да 5.000 рублёў.

2. Павялічыць з 1 чэрвеня 1992 г. штогадовую кампенсацыю расходаў на бензін, рамонт, тэхнічнае абслугоўванне аўтамабіляў і мотакалясак і запасныя часткі да іх:

інвалідам Айчыннай вайны і іншым інвалідам з ліку ваеннаслужачых, атрымаўшым згодна з дзеючым заканадаўствам бясплатна аўтамабіль «Запарожац», з 900 да 2.500 рублёў;

інвалідам Айчыннай вайны і іншым інвалідам з ліку ваеннаслужачых, атрымаўшым згодна з дзеючым заканадаўствам права на атрыманне бясплатна аўтамабіля «Запарожац» ці мотакаляскі, але набыўшым аўтамабіль іншай маркі з залікам кошту аўтамабіля «Запарожац», з 900 да 2.500 рублёў;

інвалідам Айчыннай вайны I і II груп, маючым на праве асабістай уласнасці аўтамабіль, кіраванне якім ажыццяўляюць самі ці па даверанасці іх сваякі, якія жывуць з імі ў адным населеным пункце, з 900 да 2.500 рублёў;

інвалідам Айчыннай вайны і іншым інвалідам з ліку ваеннаслужачых, атрымаўшым мотакаляску бясплатна, з 440 да 1.200 рублёў;

інвалідам Айчыннай вайны I і II груп, не маючым права на атрыманне мотакаляскі бясплатна, але набыўшым яе за наяўны разлік, з 440 да 1.200 рублёў;

інвалідам з ліку рабочых, служачых і калгаснікаў, а таксама інвалідам з дзяцінства, атрымаўшым мотакаляску бясплатна ці на льготных умовах (са скідкай да 80 працэнтаў яе кошту), з 440 да 1.200 рублёў.

Выплачваць на ўказаныя ў гэтым пункце мэты інвалідам з ліку ваеннаслужачых, рабочых, служачых і калгаснікаў, а таксама інвалідам з дзяцінства, маючым права на атрыманне мотакаляскі, але набыўшым аўтамабіль, сваякам, якія ажыццяўляюць догляд за інвалідам з дзяцінства і дзецьмі-інвалідамі ў 16 гадоў, што хварэюць на дзіцячы церэбральны параліч, якія маюць права на набыццё аўтамабіля «Запарожац» з ручным кіраваннем на льготных умовах, кампенсацыю ў размеры 2.500 рублёў.

3. Выплачваць штогод грашовую кампенсацыю замест путёўкі ў санаторый ці дом адпачынку інвалідам Айчыннай вайны I і II груп у размеры 1.500 рублёў, інвалідам Айчыннай вайны III групы, а таксама інвалідам I групы з ліку ваеннаслужачых і асоб радавога і кіраўніцкага саставу органаў Міністэрства ўнутраных спраў, інвалідасць якіх наступіла ў выніку захворвання (калецтва), атрыманага ў перыяд праходжання службы, 1.200 рублёў (па іх жаданню).

4. Выплачваць непрацуючай працаздольнай асобе, якая ажыццяўляе догляд за саставрэлым 80-гадовага ўзросту, штомесячную дапамогу ў размеры 50 працэнтаў мінімальнай заработнай платы.

Указаную дапамогу ў перыяд ажыццяўлення догляду выплачваць да ўстаноўленай гэтым непрацаздольным грамадзянам пенсіі.

5. Устанавіць, што з 1 чэрвеня 1992 г. да ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 красавіка 1992 г. «Аб пенсіённым забеспячэнні» пенсіі за выслугу гадоў работнікам адукацыі і аховы здароўя назначаюцца і выплачваюцца ў парадку і размерах, устаноўленых пастановай Савета Міністраў СССР ад 17 снежня 1959 г. № 1397 «Аб пенсіях за выслугу гадоў работнікам асветы, аховы здароўя і сельскай гаспадаркі», але не менш за мінімальны размер пенсіі па ўзросту.

6. Кампенсаваць з 1 мая 1992 г. расходы па найму жылля ў размеры 150 рублёў у месяц іншагароднім студэнтам вышэйшых, навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў пры немагчымасці іх пасялення ў інтэрнатах. Асобам, выселеным з інтэрнатаў за парушэнне правілаў пражывання, гэтыя выплаты не робяцца.

Даручыць Мінадукацыі распрацаваць у месячны тэрмін парадак і ўмовы аплаты расходаў па найму жылля.

7. Выплачваць з 1 мая 1992 г. студэнтам вышэйшых і навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў за перыяд праходжання вытворчай (педагагічнай) і вучэбнай практыкі, звязанай з выездам з месца размяшчэння навучальнай установы, сутачныя ў размеры 25 рублёў у дзень, уключаючы час знаходжання ў дарозе да месца практыкі і назад.

Студэнтам і навучэнцам, прынятым на аплачваемую работу ў перыяд праходжання практыкі па-за размяшчэннем навучальнай установы, сутачныя не выплачваюцца.

8. Прызнаць страціўшымі сілу пункты 7, 8, 10 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 1991 г. № 492 і пункты 6 і 7 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 лютага 1992 г. № 108.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. КЕБІЧ.
Кіраўнік справаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. КАЎКО.

3 чэрвеня 1992 г.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Аб далейшым павышэнні размераў дапамог і даплат насельніцтву, якое пацярпела ў выніку чарнобыльскай катастрофы

У сувязі з зацвярджэннем Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь мінімальнай заработнай платы з 1 мая 1992 г. у размеры 1.000 рублёў у месяц, а таксама ўстанаўленнем Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь з гэтага часу тарыфнай стаўкі першага разраду ў суме 1.050 рублёў у месяц і ў мэтах узмацнення сацыяльнай абароны грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Зацвердзіць і ўвесці ў дзеянне з 1 чэрвеня 1992 г. новыя размеры дапамог і даплат, прадугледжаных артыкуламі 30, 33, 37 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», згодна з дадаткам.

2. Уключыць з 1 красавіка 1992 г. у пералік відаў работ, пры непасрэдным выкананні якіх фіксіраваныя даплаты, прадугледжаныя артыкулам 33 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», робяцца ў максімальных памерах, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 красавіка 1992 г. № 232, работы па перавозцы грузаў, пагрузачна - разгрузачныя, пуцявыя і рамонтныя работы на рачным транспарце, а таксама работы, якія выконваюцца работнікамі прафесіянальнай пажарнай аховы органаў унутраных спраў.

3. Прызнаць страціўшым сілу з 1 чэрвеня 1992 г. абзац першы пункта 1 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 красавіка 1992 г. № 232 (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 12, арт. 208).

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. КЕБІЧ.
Кіраўнік справаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. КАЎКО.

3 чэрвеня 1992 г.

ДАДАТАК ДА ПАСТАНОВЫ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АД 3 ЧЭРВЕНЯ 1992 Г.

ПАВЯЛІЧАНЫЯ РАЗМЕРЫ ДАПАМОГ І ДАПЛАТ, ПРАДУГЛЕДЖАНЫХ АРТЫКУЛАМІ 30, 33, 37 ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ ГРАМАДЗЯН, ПАЦЯРПЕЎШЫХ АД КАТАСТРОФЫ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС».

1. Штомесячная грашовая дапамога на кожнага члена сям'і (артыкул 30):

у зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем—155 рублёў;

у зоне з правам на адсяленне—210 рублёў;

у зоне наступнага адсялення і зоне першачарговага адсялення—315 рублёў.

2. Фіксаваная даплата працуючым, непрацуючым пенсіянерам, насельніцтву, якое атрымлівае дапамогі, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў і навучэнцам сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў у зонах радыеактыўнага забруджвання (артыкул 33):

Зона радыеактыўнага забруджвання	Размер даплат у месяц (рублёў)				
	працуючым	пенсіянерам	атрымальнікам дапамог	студэнтам	навучэнцам
Зона пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем	160—210	130	105	155	105
Зона з правам на адсяленне: па цэзію-137— ад 5 да 10 Ки/кв. км., па стронцыю-90 ад 0,5 да 1,25 Ки/кв. км	260—420	235	130	210	155
па цэзію-137 ад 10 да 15 Ки/кв. км, па стронцыю-90—ад 1,25 да 2 Ки/кв. км	420—680	365	155	315	260
Зона наступнага адсялення	680—1.050	630	260	470	365
Зона першачарговага адсялення	1.050—1.415	1.000	395	—	525
Зона эвакуацыі (адчужэння)	1.575	—	—	—	—

3. Даплата работнікам, занятым у зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем і на тэрыторыях, не забруджаных радыенуклідамі, пры пастаяннай магутнасці дозы знешняга выпраменьвання на рабочым месцы больш за 50 мікрарэнтген у гадзіну (артыкул 37), устанаўліваецца ў размеры 365 рублёў у месяц.

Кіраўнік справаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. КАЎКО.

У Беларусь вяртаюцца мільянеры. Хоць і ненадоўга

Беларусь вачамі яе земляка — амерыканскага мільянера Джона (Івана) Вішнеўскага

Да нас прыехаў Іван Андрэевіч. Дарагі. У прамым і пераносным сэнсе. Па-першае, ён кіраўнік буйной амерыканскай фірмы «NDH» па інвестыцыях і продажу нерухомасці, мільянер, а па некаторых звестках — увогуле мільярдэр. Падругое, гэта заўсёды прыемна, калі на радзіму вяртаюцца хоць на дзень яе «блудныя» сыны. Тым больш, такога рангу.

Іван, цяпер Джон Вішнеўскі родам з-пад Слоніма, больш дакладна, з вёскі Нівы Слонімскага павета Гродзенскай губерні. У свой час сям'я Вішнеўскіх эмігрыравала ў ЗША. На сучаснай карце Беларусі такой вёскі няма, і Іван Андрэевіч пакуль што абмежваўся Мінскам, які паўстаў перад ім «сталіцай не трэцяй краіны».

«Я думаў, што прыеду ў несучаснае, бруднае мястэчка, і быў проста ўражаны. Я зразумеў, што любоў да Радзімы застанецца ў маім сэрцы да самай смерці».

Іван Андрэевіч лічыць Беларусь развітой краінай з каласальнымі магчымасцямі пры высокім узроўні прафесіянальнай падрыхтоўкі людзей і, вядома, нашай славутай стабільнасці. «Ваша няхай заганная старая сістэма здолела ўсё ж даць большасці людзей даволі неблагую адукацыю. У Амерыцы кожны чацвёрты — непісьменны. У вас ёсць добрыя магчымасці ў хуткім часе інтэграваць у сусветную эканоміку».

А яшчэ наш зямляк-мільянер запэўніў, што ў нас у параўнанні з іншымі рэспублікамі Садружнасці ёсць пачуццё ўласнай годнасці. Мы, паводле яго слоў, хочам спачатку працаваць, потым атрымліваць грошы, а не наадварот. Што ж, у час усеагульнага скептыцызму і песімізму гэтыя словы гучаць надзейя. І верай, што не ўсё яшчэ страчана.

І. Вішнеўскі не толькі таленавіты бізнесмен, чыя фірма мае штогадовы абарот у 165 мільёнаў долараў, але і пісьменнік, даволі вядомы і папулярны ў Амерыцы. Ніводная з шасці выпушчаных у Штатах яго кніг на паліцах магазінаў не залежвалася. Тэма — амаль «па Карнегі»: як максімальна выкарыстаць свае творчыя магчымасці. Адна з кніг ужо выдадзена ў Маскве, і ўвесь прыбытак ад продажу пойдзе на патрэбы нашай рэспублікі. Гэта толькі першы крок.

Іван Андрэевіч мяркуе «прывесці» ў Беларусь буйны бізнес Штатаў, укласці мільярды амерыканскіх долараў у беларускую эканоміку. Сам ён пабудаваў дзве тысячы дамоў у Штатах: офісы кампаній, установы, жыллёвыя будынкі. Як забудоўваецца сучасны Мінск, яго не вельмі натхняе, і ён мяркуе распрацаваць свой план узвядзення гасцініц, офісаў і катэджаў у сталіцы Беларусі. «Гэта будзе прыгожа», — запэўнівае Іван Андрэевіч і ўсміхаецца стопрацэнтна амерыканскай упэўненай усмешкай. І хочацца верыць, што будзе сапраўды так. Што адгукнецца на заклік адраджаць Беларусь не толькі адзін мільянер-зямляк. Што мы, нарэшце, пачнём задумвацца ўвогуле аб такой катэгорыі, як прыгажосць. Што ў нас сапраўды ёсць пачуццё ўласнай годнасці.

На развітанне Вішнеўскі сказаў, што падобная сітуацыя была і ў Штатах у перыяд вялікай дэпрэсіі. Але яны гэта ўжо прайшлі менавіта з дапамогай веры ва ўласныя сілы: «Амерыканцы — настойлівая і працавітая нацыя, і ў гэтым яны падобныя на беларусаў». Што ж, кампліменты — не самая благая рэч у свеце.

Аляксандр КОКТЫШ.

Стол для работы з кнігай

Працягваючы гэтую тэму (гл. «Хатнюю энцыклапедыю» за 22 і 29 мая), прапануем яшчэ тры ідэі для аматараў майстраваць мэблю сваімі рукамі.

7. Такая канструкцыя стала дае магчымасць працаваць, выкарыстоўваючы бакавую рухомую панель, а таксама ніжнюю перакладзіну-паліцу. На стале — своеасаблівы «латок» для кніг, прыўзняты над паверхняй стальніцы. Гэта дазваляе эканоміць месца на стале.



8. Гэта — стол з рухомым латком для паперы і іншых матэрыялаў.

9. Дзверка тумбачкі гэтага стала мае ўнутраную кніжную паліцу. Калі адчыняецца дзверка, паліца нібы высоўваецца з тумбачкі. Злева на стале — рассоўны кнігатрымальнік. Справа — настольная пераносная чатырохсекцыйная паліца для кніг. Паліца мае ў цэнтры вертыкальную вось. Паварочваючы паліцу, можна лёгка ўзяць патрэбную кнігу.



Афарбоўка драўляных сцен

Афарбоўка знешніх сцен драўлянага дома — праблема, якая паўстае перад уладальнікам дачы (садовага доміка) кожныя 5—7 гадоў. Многія аддаюць перавагу масленым фарбам. Але яны не ведаюць, што тым самым зміншаюць тэрмін жыцця дома. Аказваецца, пад слоем масленай фарбы пры пастаяннай вільготнасці развіваюцца мікраарганізмы, якія разбураюць драўніну. Акрамя таго дом, пафарбаваны масленай фарбай, амаль не «дыхае», у ім з'яўляецца дрэнны пах і г. д.

Зараз вядомы дзве вельмі танныя фарбы: шведскі і фінскі саставы, у якіх няма пералічаных недахопаў масленых фарбаў, да таго ж яны маюць і некаторыя перавагі.

Асноўныя перавагі шведскага і фінскага саставаў перад масленымі фарбамі: у паўтара раза больш трывалая; дом пасля афарбоўкі «дыхае», прычым фарба не прапускае вільгаці.

Пры паўторнай афарбоўцы дома гэтымі саставамі трэба толькі абмесці сцены венікам. Гэтымі саставамі трэба фарбаваць па сухой старой драўніне.

ШВЕДСКІ САСТАЎ:
мука (жытняя ці пшанічная) — 1.160 г;
жалезны купарвас — 520 г;
кухонная соль — 520 г;
вапнавы пігмент (сухі) — 520 г;
пакост натуральны — 480 г;
вада — каля 9 л.

З мукі і 6 л вады рыхтуюць клейстар. Робяць гэта так. Муку заліваюць невялікай колькасцю халоднай вады і замешваюць. Атрыманае цеста разбаўляюць затым халоднай вадой, памешваючы, даліваюць астатнюю (ад 6 л) ваду — кіпець. Клейстар працэджваюць і ставяць на агонь. У гарачы клейстар засыпаюць соль і купарвас і, памешваючы, раствараюць іх. Затым у гарачы раствор дабаўляюць пігмент і зноў старанна ўсё размешваюць. Тонкім струменьчыкам у раствор льюць пакост і размешваюць. Затым дабаўляюць астатнюю (3 л) гарачую ваду, разбаўляючы састаў да малярнай кандыцыі.

ФІНСКІ САСТАЎ:
мука — 720 г;
жалезны купарвас — 1.560 г;
кухонная соль — 360 г;
вапнавы пігмент (сухі) — 1.560 г;
вада — 9 л.

Гатуюць фінскі састаў такім жа чынам, як і шведскі.

Абодва саставы гатуюць у эмаліраванай пасудзіне з разліку 1—1,5 гадзіны работы. Загусцелы састаў трэба развесці да малярнай кандыцыі гарачай вадой.

Звычайна прыгатаваны састаў ухутваюць, каб ён быў цёплым на ўвесь час працы.

Абодва саставы наносяць на драўляныя паверхні жэзлам ці валікам за два разы. Фарбаваць лепш у другой палавіне дня, калі садзіцца сонца. Расход саставу — 250—350 г на 1 м². Старую масленую фарбу здымаюць з дапамогай змыўкі, якая складаецца з 1,3 кг нягашанай вапны і 0,45 кг паташу, разведзеных вадой да гушчыні смятаны. Гэтую змыўку наносяць на масленую фарбу і пакідаюць на 1,5—2 гадзіны. Затым змываюць. Пасля такой апрацоўкі фарба лёгка здымаецца.

ДА ВАПНАВЫХ ПІГМЕНТАЎ НАЛЕЖАЦЬ:
сурык жалезны — чырвона-карычневы;
паленая охра — карычневая;
охра — жоўтая.

Лечыць нават рак...

«Піце бульбяны сок, і вы назаўсёды пазбавіцеся ад хваробі» — сцвярджае карэйская газета «Пхеньян сінмун», якая апублікавала заметку аб карысці гэтага напітку.

Сок сырой бульбы вельмі карысны для хворых цукровым дыябетам, язвай страўніка, гіпертонікам, людзям, якія пакутуюць ад захворвання нырак і печані. Але самае галоўнае — ім можна лячыць рак.

У бульбяным соку ўтрымліваецца вялікая колькасць танізуючых рэчываў, а таксама вітаміну С, які згубна ўздзейнічае на ракавыя клеткі.

Шклянку прыгатаванага з 2—3 бульбін напітку п'юць раніцай да яды.

Сам сабе метэаролаг

У выпусках «ХАТНЯЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ» 22 і 29 мая мы расказалі аб прыкметах, якія вызначаюць устойлівае яснае надвор'е, і аб прыкметах перамены з яснага надвор'я на непагадзь. Сёння — чарговы раздзел — ПРЫКМЕТЫ УСТОЙЛІВАЙ НЕПАГАДЗІ.

Іх нямнога, але яны даволі надзейна вызначаюць устойлівую непагадзь.

● **Атмасферны ціск** нізкі. Ён мала вагаецца на працягу сутак.

● **Тэмпература паветра** пастаянная, з даволі малым сутачным хістаннем. Летам — тэмпература паветра ўмераная, узімку — даволі высокая (для зімы, зразумела).

● **Вецер мала** змяняецца па кірунку. Часцей за ўсё ён бывае паўднёва-заходні, радзей — паўночна-ўсходні і ўсходні. Хуткасць ветра даволі значная. Правільных сутачных хістанняў не заўважаецца. Як не заўважаецца і тых вятроў, якія бываюць характэрнымі для дадзенай мясцовасці.

● Летам **воблакі** ўтвараюць не заўсёды суцэльнае аднастайнае покрыва. Узімку неба скрозь зацягнута слаістымі і слаіста-дажджавымі воблакамі, якія часцей за ўсё нясуць з сабой мокры снег.

● **Дождж** (або снег узімку) слабы. Ён няспынна ідзе на працягу доўгага часу — гэта т. зв. ападкі цёплага фронту. Т. зв. ападкі халоднага фронту звычайна больш моцныя, але ідуць з перапынкамі.

● **Бачнасць** пры адсутнасці дажджу добрая.

● **Туман**, калі бывае, то прыземны. Раса (або шэрань узімку) адсутнічаюць. Добра чуваць аддаленыя і слабыя гукі. Змярканне, прыцемак звычайна бывае працяглым.

У наступным выпуску мы пазнаёмім вас з чарговым раздзелам цыкла «САМ САБЕ МЕТЭАРОЛАГ» — прыкметамі пераходу ад непагадзі да добрага надвор'я.

ВОЗГАЛАС РОЗГАЛАС

ЗАХОЧАШ — РАБОТА ЗНОЙДЗЕЦЦА

ПАСТАВЫ. Беспрацоўе паступова наступае і на Пастаўшчыну. У другім квартале толькі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы мяркуецца скараціць больш за 40 чалавек. Куды ім падацца? Справа ў тым, што цяпер у раёне ёсць каля 170 свабодных рабочых месц, у асноўным у сельскай гаспадарцы. Так што звольненыя без работы не застануцца. Калі, вядома, захочуць.

«НАГРУЗКІ» ЯНЫ НЕ СЦЕРПЯЦЬ

КОБРЫН. (Рыгор ПАЛЯШУК, кар. БелаПАН). У мясцовае аддзяленне «Белсаюздруку» звярнуліся прадстаўнікі газеты «Голос Берестейшчыны» ўкраінскага таварыства і газеты «Збудінне» грамадска-культурнага таварыства «Полисьсе» з настойлівай просьбай іх выданні ў «нагрузку» не прадаваць. Інакш выдаўцам будзе даволі цяжка вызначыць, які тыраж павінна захоўваць іх прадукцыя. Пакуль жа тыраж вагаецца ў межах некалькіх тысяч паасобнікаў і мае даволі значны працэнт спісання.

ВАЛЮТА ВЕРНІКАЎ — НА СПАРТКОМПЛЕКС

ГРОДНА. У рэшце рэшт «мірным шляхам» закончылася даўняя спрэчка паміж гарадской каталіцкай абшчынай і спартыўнай школай № 3. Пасля завяршэння рэстаўрацыі касцёла святога Андрэя абшчына пажадала вярнуць сабе і некалькі пабудоў, размешчаных вакол касцёла, у тым ліку і памяшканне спартшколы. Узамен вернікі выдзяляюць валюту на будаўніцтва новага лёгкаатлетычнага манежа. Ну што ж, відаць, пакрыўджаных не будзе.

З ТАКІМ АГНЁМ ЖАРТАВАЦЬ НЕ ВАРТА

Зусім нядаўна многія газеты расказалі аб злачынстве, учыненым работнікам прадпрыемства па рэабілітацыі інвалідаў афганскай вайны. І вось у міліцэйскіх аператыўных зводках зноў з'явілася інфармацыя, у якой фігуруе прозвішча яшчэ аднаго работніка гэтай арганізацыі. Супрацоўнікамі гарадокога ўпраўлення крымінальнага вышуку і УКДБ па Мінскай вобласці затрыманы нейкі М., дарэчы, раней ужо судзімы за крадзяжы і злоўжыванне службовым становішчам. На гэты раз ён вымагаў 400 долараў у мінчанина П.

Складваецца ўражанне, што пад флагам дабрачыннай ідэі хто-ніхто ўпарта імкнецца зрабіць і свой бізнес. Брудным ён атрымліваецца.

Хацелася б нагадаць, што акрамя міліцыі, якая робіць сваю справу, ёсць яшчэ адна грамадская структура. І яна не дазволіць нажывацца на бедах ветэранаў-афганцаў — гэта самі ветэраны. А іх братэрства і ўзаемавыручка вядомыя ўсім.

Сяргей РАЧЫЛА.

...АД МЯЧА І ЗАГІНУЎ

На днях у Мінску зноў адбылося забойства. Загінуў 20-гадовы мінчанін, які прыйшоў у кватэру да свайго знаёмага — работніка аднаго з вытворчых аб'яднанняў. Пасля сумеснай п'янкі малады чалавек быў пазбаўлены жыцця гаспадаром кватэры, які выкарыстаў для гэтага... меч, праўда кустарнага вырабу. Затрыманы забойца знаходзіцца ў ізалятары, праводзіцца расследаванне.

ФУТБОЛ

IX ЗАСТАЛОСЯ ТОЛЬКІ ДВОЕ...

Лета толькі-толькі набіраецца моцы, а футбалісты суверэннай Рэспублікі Беларусь паспелі не толькі прызвычаіцца да новага жыцця (маецца на ўвазе розыгрыш першага нацыянальнага чэмпіянату), а і падышлі ўжо да завяршэння спрэчкі за адзін з ганаровых трафеяў — за Кубак Беларусі. Пазаўчора згуляны паўфінальныя пардынкі. І, такім чынам, з некалькіх дзесяткаў саюзнымі каманд засталося два — мінскае «Дынама» і магілёўскі «Днепр».

Фаварыты сезона — дынамаўцы сталіцы, вядома справа, гараць жаданнем пакінуць у сёлетнім сезоне свой самы адметны след. І не без падстаў на тое. Яны — вобразна кажучы, на галаву вышэй за сапернікаў, ды і ўмовы падрыхтоўкі, паўнацэннай спартыўнай дзейнасці ў іх не параўнальныя, скажам, з тым жа «Бедрычанкам» з Рэчыцы ці «Вусцем» з Аршанскага раёна... Таму іх выхад у фінал розыгрыша Кубка РБ — заканамерны. Праўда, знаходзіліся скептыкі, якія не сумняваліся былі «адведаць» сенсацыі: а раптам сапернік дынамаўцаў — маладзечанскі «Металург» возьме ды і адмахнецца, ці, скажам, падумае-паразважае «Дынама» ды і «аддасць» (вядома ж, не за так) паўфінал: навошта яму Кубак — каманда ў чэмпіянаце аднасобны лідэр...

Але ні таго, ні другога не вышэйшла. З першай мінуты (ды не, нават секунды) гаспадары поля пайшлі ў атаку. Яшчэ нешматлікія балельшчыкі ўладкоўваліся на сваіх месцах, а Эрык Яхімовіч ужо «запаліў» на табло сваё прозвішча — 1:0. Бліжэй да перапынку другі гол у вароты маладзечанцаў забіў Радаслаў Арлоўскі. І ўжо зусім стала ўсё зразумела на 66-й мінуце матча, калі свой шанц не ўпусціў Сяргей Герасімец — 3:0.

...Дзесьці ў перапынку матча на стадыёне з'явіўся мэр Маладзечна народны дэпутат рэспублікі Генадзь Карпенка. Яго высокую постаць за варотамі дынамаўскага галіпіца Юрыя Курбыкі Ігракі «Металурга» вядома ж, заўважылі. І... асмялелі. Знайшлася яшчэ хутчэйшая, былая агрэсіўнасць і спрыт у добра вядомага аматарам спорту «маладзечанца» Георгія Кандрацьева, не ведаў, здавалася, стомы і другі былы дынамавец, а цяпер — футбаліст «Металурга» Сяргей Гоманаў. Два выпады — і двух мячоў пераваги як і не было — 2:3. Дарэчы, галы і запісалі на свой рахунак Кандрацьеў і Гоманаў. Але на больш не хапіла ў гасцей часу. Ды і іхні апякун Карпенка прыйшоў на стадыён позна...

У другім паўфінале магілёўскі «Днепр» з такім жа лікам — 3:2 выйграў у брэсцкага «Дынама». Такім чынам, у фінале розыгрышу Кубка рэспублікі сустрэнуцца «Дынама» (Мінск) і «Днепр». Матч адбудзецца 24 чэрвеня.

Анатоль ФЕДАРАЎ.

ГАНДАЛЬ... ГІСТОРЫЯЙ БЫЎ СПЫНЕНЫ НА ЧЫГУНАЧНАЙ СТАНЦЫІ ГРОДНА

ГРОДНА. (Б. Пракопчык). Апошнім часам рэзка пачасціліся выпадкі правозу кантрабанды праз чыгуначную станцыю Гродна на Захад. Вось толькі некаторыя аператыўныя паведамленні. Поезд Санкт-Пецярбург—Берлін. Вынікам аперацыі, праведзенай гродзенскімі чэкістамі і мытнікамі сумесна з Міністэрствам бяспекі Расіі, стала затрыманне аднаго з праваднікоў гэтага поезда. Па самых мінімальных ацэнках, кошт выяўленых залатых вырабаў, антыкварыяту, карцін, ікон складае амаль два мільёны рублёў. Залаты партсігар, напрыклад, цягне на 300 тысяч рублёў, гадзіннік з золата — 130, сувенірнае сярэбранае блюда з кляймом Фабержэ, па ацэнках спецыялістаў, каштуе 300—400 тысяч рублёў, адна з ікон — 167 тысяч.

Таксама ж у поездзе Санкт-Пецярбург — Берлін мытнікі выявілі 119 ікон, кошт якіх вымяраецца сотнямі тысяч рублёў. Пакуль невядома, хто меў намер пагрэць рукі на гэтых гістарычных каштоўнасцях, якія карыстаюцца вялікім попытам на Захадзе. Але схаваны яны былі даволі прафесіянальна, прычым ажно ў дзесяці месцах пяці вагонаў. Відавочна, што зрабіць гэта тайком ад абслуговага персаналу поезда немагчыма. Дарэчы, у гэтым жа поездзе, які абслугоўвала тая ж брыгада праваднікоў, але ўжо на зваротным шляху з Берліна ў Санкт-Пецярбург, выявілі паўтары тысячы газавых балончыкаў (прызначаных, мяркуючы па этыкетках на рускай мове, спецыяльна для СНД) і чатыры газавыя пісталеты.

Ва ўсіх гэтых выпадках, дзякуй Богу, кантрабанду затрымалі. Аднак гэта хутчэй за ўсё выключэнне з правіл. Пры сённяшніх адносінах да праблем мытнай службы, якая амаль не забяспечана неабходнымі для работы сродкамі, надзейны заслон на шляху злачынцаў паставіць проста немагчыма. І яны гэта добра разумеюць, пашыраючы гандаль гісторыяй і ўсім, што дае добры навар.

ЖЫЦЦЕ СТУДЭНЦКАЕ

па-гродзенску

Праблемам выжывання ва ўмовах рынку было прысвечана пасяджэнне вучонага савета Гродзенскага медінстытута. З будучага навучальнага года прыём на першы курс будзе зменшаны з-за адкрыцця медінстытута ў Гомелі. А гродзенцы збіраюцца стварыць ўласную гаспразліковую кансультацыйную паліклініку, адкрыць малыя прадпрыемствы, супрацоўнічаць з замежнымі калегамі.

па-віцебску

З 490 будучых дыпломнікаў віцебскіх гарадскіх вышэйшых навучальных устаноў толькі 258 ведаюць, дзе яны будуць працаваць. З больш чым пяцісот навучэнцаў тэхнікумаў 144 наогул не маюць уяўлення аб сваім будучым рабочым месцы.

па-брэсцку

Паводле даных сацыялагічнай групы Брэсцкага політэхнічнага інстытута, толькі 20 працэнтаў студэнтаў хацелі б паехаць за мяжу, а 66 працэнтаў студэнтаў жадаюць звязаць свае будучыню з Беларуссю. Аднак і тыя, і другія адзначылі, што магчымасці паехаць за мяжу ў іх ўсё роўна няма.

па-магілёўску

Згодна з некаторымі звесткамі, Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут пачне новы навучальны год у якасці Магілёўскага тэхнічнага універсітэта. Што зменіцца са змяненнем статуса, пакажа час.

па-мінску

Студэнты Мінскага радыётэхнічнага інстытута трымаюць авангардае месца ў рыначнай эканоміцы сярод ВНУ Беларусі. Прама ў інтэрнатах, з набытых невядома дзе дэталей, яны робяць чорна-белыя і каляровыя тэлевізары, якія ні па якасці, ні па кошту не адрозніваюцца ад лепшых айчынных марак. А днямі студэнты РТІ пачалі нават выдаваць уласную газету «Радыёрынак» з мэтай аб'яднання ўсіх выканаўцаў у галіне радыётэхнікі.

ПРЫРОДУ ТРЭБА БЕРАГЧЫ

Сёння, 5 чэрвеня, Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя.

Для многіх прадпрыемстваў рэспублікі гэта—цяжкі напамінак аб сваіх нявыкананых планах па ахове экалогіі. Па-ранейшаму, хоць і ў меншых памерах, «дымяць» Мінскі трактарны завод. Пастановай Мінгарвыканкома яму прапанавана да 1 студзеня 1994 года скараціць выкіды шкодных рэчываў у навакольнае асяроддзе на 2.000 тон. Зараз, калі МТЗ будзе эвыш устаноўленага ліміту забруджваць навакольнае асяроддзе, яму прыйдзецца плаціць за гэта ў пяцікратным памеры. За парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства да адміністрацыйнай адказнасці тут прыцягнуты пяць кіраўнікоў цэхаў.

Алег ПРАЦЬКО.

А Шапашнікаў супраць...

Да нас дайшла інфармацыя, што пры ўсіх неблагіх адносінах паміж Генштабам Узброеных Сіл Садружнасці і Міністэрствам абароны Беларусі адбылося «несупадзенне» інтарэсаў двух бакоў. Спрэчным момантам выступіла пінская марская школа, якую ніяк не могуць падзяліць. Маршал Шапашнікаў пакуль не хоча пагадзіцца з нацыяналізацыяй гэтага «стратэгічнага» аб'екта.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

«БІ-БІ-СІ»

★ У Рыо-дэ-Жанейра пачаўся Сусветны экалагічны форум пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Выступаючы на яго адкрыцці, Генеральны сакратар ААН Бутрас Галі гаварыў аб важнасці гэтага форума. На працягу двух тыдняў работы яго тысячы далегатаў разгледзяць пытанні аб тым, як захаваць жыццё на планеце, дапамагчы развіццю бедных краін і інш.

★ Узбекістан прыступіў да выпуску ўласнай валюты з-за недахопу грошай былога Саюза ССР.

★ Як паведамілі расійскія ўлады, у выніку выбуху на борце атамнай падводнай лодкі непадалёку ад Мурманска адзін чалавек загінуў і пяць—атрымалі апёкі. Інжынер-электрык капітан Юшкоў загінуў у час выпрабавання электракампрэсара пасля таго, як у ім выявіліся непаладкі.

★ Пасля некалькіх дзён адноснага зацішша ў Прыднястроўі ў раёне горада Дубасары зноў успыхнулі баі. Вярхоўны Савет Прыднястроўя прагаласаваў за тое, каб накіраваць малдаўскаму парламенту ультыматум, які патрабуе прызнання перамоў адносна федэрацыі. У выпадку адмаўлення ад перамоў ва ўльтыматуме гаворыцца аб тым, што ў Прыднястроўі заручацца ваеннай падтрымкай сваёй барацьбы за незалежнасць.

РАДЫЁ «СВАБОДА»

★ Спробы ўкраінскай апазіцыі адхіліць ад улады прэм'ер-міністра Вітольда Фокіна закончыліся няўдачай. Парламент рэспублікі нязначнай большасцю галасоў адвергнуў заклік апазіцыі вынесці вотум недаверу ўраду. Раней прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук выступіў у падтрымку Фокіна, заявіўшы, што адставка прэм'ер-міністра не вырашыць праблем, якія накапіліся цяпер. Краўчук катэгарычна выказаўся супраць ідэі прыняцця на сябе паўнамоцтваў прэм'ер-міністра, сказаўшы, што гэта было б вельмі блізка да дыктатуры.

★ Першы віцэ-прэм'ер Расійскай Федэрацыі Ягор Гайдар заявіў, што ўрад выкарыстае частку сваіх залатых запасаў для выплаты заработнай платы тым, хто яе даўно не атрымлівае, з-за недахопу наяўных грошай. Гайдар паведаміў, што ў шэрагу рэгіёнаў прадпрыемствы атрымаюць залатыя манеты замест папяровых грошай, якіх сёння катастрафічна не хапае.

★ Прэзідэнт савета міжнароднага радыёвяшчання Форбс адкрыў у Кіеве бюро радыёстанцыі «Свабода» і «Свабодная Еўропа». На цырымоніі ён зазначыў, што ўзначальваемы ім савет шчаслівы аказаць садзейнічанне развіццю ўкраінскай незалежнасці.

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

★ Былы прэзідэнт Злучаных Штатаў Рычард Ніксан сустрэўся ўчора ў Маскве з прэзідэнтам Расіі Барысам Ельцыным. Ніксан сустрэнецца таксама з віцэ-прэзідэнтам Аляксандрам Руцкім, першым віцэ-прэм'ер-міністрам Ягорам Гайдарам, дзяржаўным сакратаром Расіі Генадзем Бурбулісам. Мэта візіту Ніксана — спрыяння патоку амерыканскага прыватнага капіталу ў расійскую эканоміку і разгортванне работы па падрыхтоўцы менеджараў у суверэннай краіне.

★ Як паведаміў лідэр Польскай сялянскай партыі Павлак, прэзідэнт краіны Лех Валенса прапанаваў яму заняць пост прэм'ер-міністра краіны і прыступіць да фарміравання новага ўрада на кааліцыйнай аснове. Учора гэту прапанову павінен быў разгледзець польскі сейм.

★ Украінскі парламент адобрыў прапанову аб уступленні рэспублікі ў Міжнародны валютны фонд і Сусветны банк.

★ Прэзідэнт Тайваня прыняў у сваёй рэзідэнцыі звыш сарака вядомых вучоных з розных краін свету, у тым ліку і з Кітая. Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, трое з кітайскіх вучоных — члены Камуністычнай партыі гэтай краіны. Паводле сцвярджэнняў афіцыйных асоб Тайваня, гэта была першая сустрэча іхняга прэзідэнта з кітайскімі камуністамі.

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

ПАНЯДЗЕЛАК, 8 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

16.30. Навіны.
16.35. Экран дзіцячага фільма. «Блукаючыя агеньчыкі». 1-я серыя.
17.40. «Ліса, мядзведзь і мужык», «Дзень загадак». Мультфільмы.
18.00. «Колас жытам наліваецца». Перадача з Гомеля.
18.20. «Драга». Кінанарыс.
18.30. Маладыя салісты беларускай оперы. Марат Грыгорчык.
19.00. Абласныя навіны (Брэст).
19.10. Наш каментарый. «Вы нам пісалі...»
19.20. Амерыка: бацькі і дзеці. Перадача 2-я.
19.40. Тэлепраграма «Культура».
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Спартыўны тэлекур'ер.
21.45. Тэлеаўкцыён запрашае...
21.50. «Паэтычная гасцёўня». Алег Лойка і Алег Атаманаў.
23.00. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Ранішняя гімнастыка.
8.00. Навіны.
8.20. Мультфільмы.
9.10. Дак. фільм «Голас сакса-фона».
9.30. «Завяшчанне прафесара Доўэля». Маст. фільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Старадаўні раманс». Выконвае А. Эйзен.
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Гэта было, было...
14.40. «Аварыя». Маст. фільм. 1-я серыя.
15.50. Адпачывай.
16.05. «Шмат галасоў — адзін свет». «Джайпа» (Ісландыя).
16.15. «Госці дзіцячага фестывалю».
17.00. Навіны.
17.25. НЭП.
18.00. Футбольны агляд.
18.30. «Далёка ад вайны». Маст. фільм.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Новая студыя» прадстаўляе: «Бамонд», «Аўтарская песня», «Пісьмы з Санкт-Пецярбурга», «Будка галоснасці». У перапынку (23.00) — Навіны.
24.00. «Аварыя». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.25. Італьянская мова.
8.55. Вольны час. «Калекцыянер».
9.10. Першы тайм.
9.25. Пілігрым.
10.10. Цішыня № 9.
11.10. «Выйсці замуж за капітана». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне. «Сяўба».
13.00—13.20. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. Дзіцячая гадзіна (з урокам французскай мовы).
16.15. Чэмпіянат Еўропы па самба.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Шляхі міласэрнасці».
17.45. Канверсія на фоне рынку.
18.00. Тварам да Расіі.
18.15. Дыялогі дылетантаў.
18.45. Крымінальныя паведамленні.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара».
20.25. Відэафільм. «Хто мы?» «Зямля заклікае да ісціны».
22.00. Весткі.
22.20. Свет спорту вачыма фірмы «Жылет».

АЎТОРАК, 9 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. «Мілы гай». Музычны фільм.
8.55. Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах за курс сярэдняй школы.
9.00. «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі». Мастацкі фільм.
16.30. Навіны.
16.35. «Блукаючыя агеньчыкі». 2-я серыя.
17.40. «Рыка-чубарык». Мультфільм.
18.00. «Гэтыя цудоўныя рукі». Дак. фільм.
18.25. «Выбіраем «Форд». Відэафільм.
19.00. Абласныя навіны (Віцебск).
19.10. Наш каментарый. «У бой ідуць балбатуны».
19.15. Форум дзелавых людзей. Дні эканомікі Беларусі ў Лейпцыгу.
19.40. Эканамічная хваля. «А дзе мне ўзяць такую рэпку...» Забеспячэнне рэспублікі садавінай і гароднінай. Прамая лінія.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі». Маст. фільм.
23.20. НІКа.

І канал. Астанкіна.

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Ранішняя гімнастыка.
8.00. Навіны.
8.25. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
9.10. Мультфільмы «Меднай гары гаспадыня», «Аднойчы летам».
9.45. «Далёка ад вайны». Маст. фільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
13.00. Брыдж.
13.25. Свет грошай Адама Смітa.
13.55. Блакнот.
14.00. Навіны.
14.20. Урокі Вольгі Івановай.
14.35. «Аварыя». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.35. «Праклятая кніга». Мультфільм.
15.50. Фільм — дзецям. «Майскі снег».
17.00. Навіны.
17.25. Сельскія хронікі.
17.55. Авіякасмічны салон.
18.10. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
18.55. Тэма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Нялёгка з мужчынамі» (Югаславія).
22.00. Фермата.
22.20. «Ведзі».
23.00. Навіны.
23.25. Дзевятка.
23.55. «Аварыя». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

10.05. «Бурда модэн» прапануе...
10.35. «Сакрэты тэатра Камала».
11.50. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00.—13.20. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. Студыя «Рост». «Пятнаццацігадовы капітан».
15.45. Чэмпіянат Еўропы па самба.
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Сустрэча з музыкай». Перадача 4-я.
17.45. Праграма «Ключ».
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Рэпартаж з НАТО.
18.45. Фальклор.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара».
20.25. Відэафільм. «Хто мы?» «Зямля заклікае да ісціны».
22.00. Весткі.
22.20. Свет спорту вачыма фірмы «Жылет».

СЕРАДА, 10 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. «Малахіт». Кінанарыс.
8.55. Выпускныя экзамены па алгебры за курс базавай школы.
9.00. Студыя «Мэта».
16.30. Навіны.
16.35. «Кароль і дыня», «Кот Леапольд у сне і наяве». Мультфільмы.
17.00. «Голас». Літаратурна-мастацкі відэаканал.
18.00. «У чаканні суда». Перадача з Віцебска.
18.45. Дак. фільм «Чэгем».
19.00. Абласныя навіны (Гомель).
19.10. Наш каментарый. «Ракетны парасон» для Беларусі».
19.15. Бізнес-клуб «Партнёр» запрашае... Узаемаадносіны кіраўнікоў дзяржаўных і камерцыйных структур.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. «Адыходзячы жнівень». Маст. фільм.
22.40. НІКа.
22.55. Футбол. «Дынама» (Мінск) — «Будаўнік» (Старыя Дарогі).
23.40. Першы адкрыты чэмпіянат Беларусі па скачках хартоў.

І канал. Астанкіна

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Ранішняя гімнастыка.
8.00. Навіны.
8.25. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
9.55. Дак. фільм «Дабрагост».
10.15. Мультфільмы «Хто мацнейшы?», «Як браты пальцы пасварыліся».
10.30. Маладыя — у нетрадыцыйнай медыцыне.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
12.05. Валейбол. Першынство сусветнай лігі. Мужчыны. Зборная ЗША — зборная СНД.
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Сёння і тады.
14.55. «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». Маст. фільм. 1-я серыя.
16.00. Рок-макс.
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
18.00. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
18.45. «Апошні з горача закаханых». У. Зельдзін.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.30. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Цырымонія адкрыцця. Зборная Швецыі — зборная Францыі. Пасля заканчэння — Навіны.
23.20. Шмат музыкі.
0.10. «Сярэбраны ўэрост». Маст. фільм.

Канал «Расія»

9.15. Педагогіка для ўсіх.
9.55. «К-2» прадстаўляе: праграмы «Медыя», «Абзац», «3, 2, 1». Маст. фільм. «Дзень анёла».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. «Васіліса Прыгожая». Маст. фільм.
16.25. Мастацтва адлюстравання. «Два Уладзіміры ў пошуках святла».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Далёкі Усход».
17.45. Версія.
18.00. Апазіцыя.
18.45. Крымінальныя паведамленні.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Гульня «Лога».
20.00. Белыя ночы.
20.20. Д. Сэлінджэр. «Лапа-расціпа».
21.25. На сесіі ВС Расіі.
22.00. Весткі.
22.20. Пецярбургскі міф А. Хвасценка.
22.55. Экзотыка.

ЧАЦВЕР, 11 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Адыходзячы жнівень». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. «Добры дзень у хатуі!» Сярэдняя школа № 108 г. Мінска.
17.10. «Ромка, Фомка і Артос». Фільмы 1-ы, 2-гі, 3-ці. «Вер-невер». Мультфільмы.
18.00. «Фазаны». Кінанарыс.
18.10. Радаўніца ў Левашове.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце мае пісьмо...
19.15. Якія мы гаспадары? Энергазберагаючыя рэсурсы.
19.35. Шанц. Шоу-гульня.
20.10. Тыдзень беларускага ўрада.
20.25. Тэлеаўкцыён.
20.30. «Перавадоленне». Кінанарыс.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Студыя «КІТ».
23.40. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Ранішняя гімнастыка.
8.00. Навіны.
8.20. Мусульманскае свята Курбан-Байрам.
9.20. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
10.50. «Квака-задавака». Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. У свеце жывёл (з сурдаперакладам).
12.05. Валейбол. Першынство сусветнай лігі. Мужчыны. Зборная ЗША — зборная СНД. Перадача з ЗША.
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. «Пад дахам фантаннага дома». Канцэрт у Доме-музеі Г. Ахматавай.
14.55. «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». Маст. фільм. 2-я серыя.
16.00. Разам з чэмпіёнамі.
16.15. Дзіцячы музычны клуб.
17.00. Навіны.
17.30. ...Да 16 і старэйшым.
18.10. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
18.55. «Тэлевізійнае знаёмства». Урмас От гутарыць з Анджэем Вайдам.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Паненні з Вілка». Маст. фільм (Польшча).
22.25. «Чорная скрыня».
23.00. Навіны.
23.25. Хіт-парад газеты «Вечерняя Москва».

Канал «Расія»

9.20. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Цырымонія адкрыцця. Зборная Францыі — зборная Швецыі.
11.50. «Санта-Барбара».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00.—13.20. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. У свеце жывёл.
16.15. Візаві.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Прастора плюс.
17.30. Расія і свет.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Пятае кола.
20.25. У свеце аўта-і мотаспорту.
21.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Югаславіі — зборная Англіі.
23.15. На сесіі ВС Расіі.
23.45. Тур-клуб.

Спецыяліст раіць

Пры лячэнні цялят, хворых страўнікава-кішачнымі захворваннямі, многія цялятніцы прымянялі розныя адсарбіруючыя рэчывы. Найбольш эфектыўныя вугаль печанага хлеба і адвар кавы.

Хлебны вугаль у кішэчніку адсарбіруе газы, таксіны, мікробы. У гэтых адносінах ён уступае толькі актывізаванаму вугалю. Для яго прыгатавання бяруць добра выпечаны хлеб з 85-працэнтнай мукі, рэжуць на дробныя кавалачкі і ставяць на патэльні ў добра напаленую печ. Затым згарэўшы хлеб таўкуць у ступцы да атрымання дробнага аднароднага парашку.

100 г вугалю добра размешваюць у літры гатаванай вады. З прафілактычнай мэтай даюць цялятам (па 10 мл на 1 кг жывой вагі) пасля паення малозівам або малаком. Апрача таго, можна раскладваць кавалачкі вугалю па кармушках — цяляты пачынаюць іх есці на 4—5-ы дзень жыцця. Асабліва ахвочна яны ядуць вугаль з падсоленага хлеба (пры выпяканні дадаюць па 35—40 г. сталовай солі на кілаграм).

Хворых цялят на 10—12 гадзін пакідаюць галодными і кожныя 2—3 гадзіны даюць ім парашок вугалю на чыстай гатаванай вадзе. Перад скормліваннем добра ўзбоўтваць. Праз 1—1,5 гадзіны пасля першай дозы вугалю маладняку даюць слабіцельнае.

Для прыгатавання адвару кавы бяруцца 20 г жалудовай або 50 г ячменнай кавы на 1 л вады. Адварам пояць хворых цялят у першы дзень лячэння ўдосталь, 4—5 разоў, узамен малака; на другі дзень па 0,5 л за 30 хвілін да кармлення.

Кожны жывёлавод ведае, колькі клопатаў, калі ў яго падапечных расстройваецца жывот. Калі ўсе вядомыя спосабы выпрабаваны, можам прапанаваць такі рэцэпт. Шклянка кумрузы прасмажваецца на патэльні да шакаладнага колеру. Ахалоджаныя зярняты двойчы перамолваюцца на мясарубцы. Дзве сталовыя лыжкі гэтага парашку ўсыпаюцца ў літр малака.

Парады на ўсякі выпадак



Здараецца, што ШКЛО У КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ ці шафе «заядае», цяжка ходзіць у драўляным пазе. Каб гэтага пазбегнуць, дастаткова ніжнюю грань шкла злёгку змазаць вазелінам.

Перад тым як пачаць РАМАНТАВАЦЬ ДАХ, умацуйце на лесвіцы гарызантальныя апоры. Яны зробяць яе больш устойлівай і абароняць вадасцёкавы латак з ніжняга краю даху ад пашкоджання стаякамі лесвіцы.



ЛАТА НА ПЕРАГАРОДЦЫ атрымаецца больш надзейнай, калі вы перад тым як атынкаваць, дзірку па перыметру абаб'еце цвікамі.

Калі вам трэба шчыльна ЗАКРЫЦЬ ШКЛЯНЫ СЛОІК, а пад рукамі няма накрыўкі, можна выкарыстаць цэлафан. Кавалак яго змачыце вадой, накрыйце ім гарлавіну слоіка, загніце краі ўніз, завяжыце шпагатам. Цэлафан высахне і нацягнецца, шчыльна закрыўшы слоік.

ПРЫМАЦАВАЦЬ БРУС да няроўнай паверхні, напрыклад да сцяны рубленай хаты, так, каб ён шчыльна прылягаў, не вельмі проста. Зрабіце капір. Затачыце канец лінейкі і прасвідрыйце ў ёй некалькі дзірак. Прыклаўшы драўляны брус да паверхні, да якой ён павінен датыкацца, можна рабіць разметку.



Не так лёгка ВЫМЕРАЦЬ ДАЎЖЫНЮ ДЭТАЛІ, якая выгнута ў некалькіх напрамках. Зрабіць гэта дапаможа ізаляцыйная палоска, якую трэба наклеіць па ўсёй даўжыні дэталі, а потым зняць і вымераць.



Прыпарачкі з пясочкам

ЛЯКАРСТВАМ МОЖА СЛУЖЫЦЬ І ПЯСОК, ВЯДОМА, ЧЫСТЫ, ЛЕПШ РАЧНЫ.

Для выкарыстання ў выглядзе грэлкі нагрэты да 55—60 градусаў пясок насыпаюць у мяшочкі, якія шчыльна прыкладваюць да хворага ўчастка цела.

Да ваннаў з гарачага пяску звяртаюцца пры закрытых ранах і пры адсутнасці павязак. Пясок награваюць да 40—46 градусаў і насыпаюць у таз або скрынку з дрэва адпаведнага размеру. Працягласць працэдуры 15—30 хвілін.

Ва ўсіх выпадках, **калі няма процівпаказанняў** (асабліва пры кантрактурах і абмежаванай рухомасці ў суставах), лячэнне пяском трэба спалучаць з лячэбнай фізкультурай і масажам, якія праводзяцца, як правіла, непасрэдна пасля цеплавой працэдуры. Пры лячэнні вынікаў ранення кісці вельмі карысна пачынаць адначасова працэдуры з пяском і лячэбную фізкультуру, напрыклад, у выглядзе рухаў хворай рукі ў гарачым пяску.

Гарачым пяском лечаць: рубцы, тугарухомасць суставаў кантрактуры, траўматычныя і запаленчыя працэсы, якія суправаджаюцца болем, абмежаваннем рухомасці; запаволенае або лішняе акасцяненне, неўралгіі і неўрыты, хранічныя і падвострыя запаленчыя працэсы.

Прымяненне яго процівпаказана ў тых выпадках, калі нельга праводзіць цеплавыя працэдуры: востры перыяд

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

ПЯТНІЦА, 12 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Шклянка вады». Маст. фільм, 1-я і 2-я серыі.
16.30. Навіны.
16.35. Сем колераў радасці.
17.10. «Прыгоды маленькіх сяброў». «Залатыя словы». Мультфільмы.
18.00. «Доктар, зрабіце мяне прыгожай», «Анатоль ды Валянціна з кардона № 8». «Мастацтва ўсіх часоў і народаў». Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Наш каментарый. Чужы сярод «сваіх».
19.15. Тры кіты. Мастацка-публіцыстычная праграма.
20.15. Студыя «Тэлесябрына». «Калі помнім...»
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлеаўкцыён запрашае...
21.30. Тэлебіржа.
21.45. «Распарадчык балю». Маст. фільм (Польшча).
23.30. НІКа.
23.45—0.25 Міжнародныя спаборніцтвы па кікбоксінгу сярод прафесіяналаў.

1 канал. Астанкіна

7.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Даніі — зборная Англіі.
8.40. «Казка пра Іграву паход». Мультфільм.
9.05. Як дабіцца поспеху.
9.20. «Музычныя інструменты і іх гісторыя» (Германія). 2-я серыя «Валынка».
9.50. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
10.35. «Паехаць — застацца...» Аб лёсах інтэлігенцыі, якая аказала супраціўленне таталітарнаму рэжыму.
11.25. Паэзія ў музыцы.
11.55. Відавочнае-неверагоднае
12.35. «Заліў шчасця». Маст. фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. «Адзін дзень у Крамлі».
15.05. Світанні Расіі.
16.35. ТБ «Нява»: «Хто з намі?»
16.55. «Страчаная «Галактыка». Мультфільм.
17.00. «Кубак з Мурана». Маст. фільм з серыяла «Палаўнічыя на шэдэўры» (Італія).
18.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Галандыі — зборная Шатландыі. У перапынку (19.00) — Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цудаў», «Ток-шоў», «Адпачывай!»
23.00. Навіны.
23.20. «Цень буравесніка». Канцэрт, прысвечаны Дню незалежнасці Расіі.
0.50. «Інспектар Гул». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. У. Яхантаў чытае вершы А. С. Пушкіна.
8.25. «Галасы з дзяцінства». Харавая студыя на Чырвонай Прасні.
9.10. Непазнаны Сусвет.
9.55. Вольны час. «ТВ-атэлье».
10.10. Фальклор. «Невядомыя культуры».
10.55. «Вехі. Адзін дзень з жыцця Расіі».
11.25. «Чароўны пярсцёнак». Лялечны спектакль.
12.15. «Я заўсёды буду побач». Дабрачынны канцэрт.
13.00. Весткі.
13.20. «Стрэлы Робін Гуда». Маст. фільм.
14.40. «Спыніцца, азірнуцца...»
15.25. Канцэрт ансамбля «Бярозка».
15.55. «Ордэн Арла — узнагарода Расіі».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Лёгкая атлетыка. Мемарыял братоў Знаменскіх.
17.55. Вінілавыя джунглі.
18.25. «Залатая шпора».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Тры таполі на Плюшчысе». Маст. фільм.
20.45. Мульці-пульці. «Будзе ласкавы дождж...»
21.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная СНД — зборная Германіі.
23.15. «У Тэрпсіхоры». Балетны агляд.

СУБОТА, 13 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Жыла-была мара». Фільм-канцэрт.
9.40. Паказвае Гомель. «Рэгіён».
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Іграе Марына Яшвілі (скрыпка).
11.55. 20 мінут рэдактара.
12.15. «Духоўная спадчына». Старажытнае славянскае баявое мастацтва.
13.00. Выратуй і захавай.
13.45. «Суперкніга». Мультфільм. 5-я серыя.
14.20. «Майстар». Дак. фільм.
14.45. «Спявае Герард Васільеў».
15.00. Тэлеаўкцыён.
15.05. «Будзьце здаровыя!» Рэспубліканскі конкурс «Педагог года-92 дашкольных устаноў».
15.40. Аўтарскі канцэрт Генрыха Вагнера.
17.40. Грамадская думка. Бізнес не ведае межаў. Прымае ўдзел старшыня Дзяржаўнага камітэта па знешнееканамічных сувязях Рэспублікі Беларусь У. В Радкевіч. Прамая лінія.
19.00. Пярэзвы. Заключны канцэрт I Рэспубліканскага фестывалю беларускага народнага танца. Першае аддзяленне.
19.40. Мультфільмы для дарослых «Шчасліўчык», «Пачвара».
20.00. Пярэзвы. Другое аддзяленне.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Сінема» прадстаўляе: «Венвенута» (Бельгія — Францыя — Італія). Маст. фільм.
23.20. НІКа.
23.35. Футбол. КІМ (Віцебск) — «Днепр» (Магілёў).

I канал. Астанкіна

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная СНД — зборная Германіі.
9.00. Радыё «Труба».
9.30. Цэнтр.
10.10. Эльдарада.
10.40. Музычны кіёск.
11.10. Экалагічная хроніка.
11.25. «Дом на Валхонцы». Пра музей выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна.
12.15. «Немцы ў другой сусветнай вайне» (Германія). Фільм 1-ы «Уступленне ў вайну».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. «Казка аб цудоўнай Айсуду». Маст. фільм.
15.40. «Кацяня з вуліцы Ліюкова». Мультфільм.
15.50. Чырвоны квадрат.
16.30. «Сустрэчы з майстрамі». К. Бергонцы, І. Перльман.
17.00. Мецэнат Сава.
17.45. «Пчала Мая». Мультфільм.
18.10. «Ганна Карэніна» Маст. фільм (ЗША).
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Што? Дзе? Калі?
21.35. Аншлаг, аншлаг... «Смех у мяшку».
23.00. Навіны.
23.15. Валейбол. Першынство сусветнай лігі. Зборная СНД — зборная Японіі.
0.15. Лёгкая атлетыка. «Крамлёўская міля».
0.45. «Інспектар Гул». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Баскетбольны агляд НБА.
7.50. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Галандыі — зборная Шатландыі.
9.30. Калі вам за...
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
12.00. Лёгкая атлетыка. Мемарыял братоў Знаменскіх.
13.00. Весткі.
13.20. «Ішоў сабака па раялі». Маст. фільм.
14.25. «Вялікі малы бізнес». Да выхаду ў Усерасійскай канфедэрацыі прадпрымальнікаў.
14.55. XX стагоддзе: у кадры і за кадрам. «Дарагі Мініта Сяргеевіч».
16.25. Расійскае бюро падарожжаў.
17.10. Кантрасты.
17.45. Парламенцкі веснік.
18.00. «Маналогі С. Юрскага».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Дзень добры і бывай». Маст. фільм.
21.00. Зусім сакрэтна.
22.00. Весткі.
22.20. Спартыўная карусель. Швецыя-92.
22.35. Праграма «А».
23.35. Вячэрні салон.

НЯДЗЕЛЯ, 14 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі
8.45. «Падарожжа мсье Перышона». Маст. фільм.
10.00. «Басейн». Дак. фільм.
10.10. Парады ўрача.
10.25. Пра шахматы і шахматыстаў. Заключны тур конкурсу Вядучая — міжнародны гросмайстар К. А. Зварыкіна.
11.05. Літарынка.
11.35. Студыя «Мэта». Прэзентацыя рэспубліканскага цэнтра нацыянальных мастацкіх праграм (паўтор).
12.20. Асілак. Прамая лінія.
13.00. НІКа.
13.45. «Метычара — эвер марскі». Маст. фільм з субтітрамі
15.10. Клуб вясёлых і знаходлівых. Другі паўфінал Рэспубліканскага турніру.
16.55. Мецэнат. Гісторыя і сучаснасць.
17.50. «Сігма-92». Фестываль бальных танцаў.
18.30. Леанід Захлеўны: у кадры і за кадрам.
20.00. Панарама.
20.25. На шляху да Барселоны. Віталь Шчэрба. Спартыўная гімнастыка.
20.40. Калыханка.
21.00. Тэлеаўкцыён.
21.05. «Лаціна-амерыканец». Маст. фільм (ЗША).
22.40. Шоу-казіно.

I канал. Астанкіна

6.00. Гадзіна сілы духу.
7.00. Рытмічная гімнастыка.
7.30. Тыраж «Спортлата».
7.40. IX Міжнародны фестываль «Вясёлка».
8.10. Свята рускага праваслаўя «Сёмуха».
8.30. Раным-рана.
9.10. Магчыма ўсё
9.40. Раніцняя зорка.
10.30. Пад знакам «пі».
11.20. «Ах, прынцэса!» Мультфільм.
11.30. Кропка над «і».
12.10. Новае пакаленне выбірае.
13.00. КТБ-1 і канал «Франс інтэрнасіяналь»: «Запаведнікі дзікай прыроды». Фільм 3-ці.
13.30. «Марк і Сафі». Маст. фільм. Фільм 3-ці.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Тэлеэкспедыцыя.
16.05. «Шмат галасоў — адзін свет». «Сямейная спрэчка» (Узбекістан).
16.15. Панарама.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Адкрыццё I Міжнароднага юнацкага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага ў Маскве.
20.15. Вынікі.
21.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Швецыі — зборная Даніі. У перапынку (22.00) — Спартыўны ўікэнд.
23.25. Пяць плюс.
0.25. «Роздум на тэму «Гамлет». Фільм-балет.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Дак. панарама: «Вяртанне ў Ялец».
7.50. Чэмпіянат свету па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА.
8.50. «Хочаце, верце...»
9.20. «Размовы папросту». Перадача 4-я.
10.05. «Суперкніга». Мультфільм. 16-я серыя.
10.35. Аты-баты...
11.05. Кар'ера. Конкурсная праграма.
12.05. «Не смехам адзіным...» З. Паперны і Л. Лебядзінская.
12.50. Зігзаг удачы. Адборачны тур.
13.00. Весткі.
13.20. «Скрыпач». В. Трацяцякоў. Фільм 5-ы.
14.15. «У горадзе С». Маст. фільм.
15.55. «З усмешкай з Тбілісі». Дабрачынны канцэрт. Частка 2-я.
17.00. Момант ісціны. Былы дырэктар Чарнобыльскай АЭС В. Брухаў адказвае на пытанні А. Каравулава.
18.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Францыі — зборная Англіі.
20.15. Свята кожны дзень.
20.25. Тварам да Расіі.
20.45. Чэмпіянат свету па аўтагонках у класе формула-1.
23.15. Рок-кафэ.

На Свіслачы.
Фота А. АНТАШКЕВІЧА.

Раўбічы: цёплы прыём і добры адпачынак

У гэтым годзе спаўняецца роўна дваццаць гадоў з таго часу, як з'явіўся на свет спорткомплекс Раўбічы. А праз два гады пасля свайго нараджэння ён прыняў першы чэмпіянат свету па біятлону. Старт аказаўся ўдалы. І неўзабаве Раўбічы сталі буйным лыжным цэнтрам, у якім рэгулярна праводзяцца міжнародныя спаборніцтвы.

Праўда, апошнім часам у сувязі з распадам былога Савецкага Саюза спартыўнае жыццё ў Раўбічах крыху прыцішылася. Можа, гэта толькі здаецца?

— Жыццё ў нас ідзе сваім ходам, — гаворыць дырэктар спорткомплексу Аляксандр Хандогін. — Раўбічы працуюць з поўнай нагрузкай. Аказваем паслугі ўсім жадаючым адпачыць ці падрыхтавацца да стартаў. Кожны за гэта плаціць. І нацыянальная зборная, і прадпрыемствы — для нас усе роўныя.

— Пасля распаду СССР ці не збіраюцца комплекс дзяліць: трамплін — украінцам, стрэльбішча — беларусам, гасцініца — рускім?

— Ды што вы! Раўбічы — гэта рэспубліканскі цэнтр. І будавалі яго беларускія будаўнікі.

Праўда, Дзяржкамспорт СССР удзельнічаў у яго будаўніцтве. І да першага чэмпіяната свету ім было выдзелена каля мільёна рублёў. Але ж Дзяржкамспорт з'яўляўся арганізатарам гэтых спаборніцтваў і не мог прыехаць на ўсё гатовае.

— Атрымліваецца, што Раўбічы — гэта база беларускай нацыянальнай каманды. Ну, а калі, напрыклад, Вяльбе, Смірноў ці Разцова захочуць патрэніравацца тут?

— Хоць і было такое меркаванне, што «спорт знаходзіцца па-за палітыкай», але гэта хлусня. Палітыка заўсёды ўплывала і, думаю, будзе ўплываць на спорт. Але я сёння не бачу ніякіх перашкод, каб «чужы» спартсмен прыехаў сюды. Няхай ён толькі ўзважыць свае магчымасці — заплаціць за ўсе паслугі.

— Раней першынство свету па біятлону, Кубак свету па лыжах арганізоўвалі саюзныя структуры. А хто цяпер будзе гэтым займацца?

— Цяпер спаборніцтвы будуць праходзіць пад эгідай рэспубліканскага аргкамітэта, у якога, натуральна, з'явяцца свае партнёры, спонсары...

— І калі, прыкладна, у Раўбічах можна будзе ўбачыць у барацьбе за сусветнае першынство «страляючых» лыжнікаў?

— Калі шчыра — не ведаю. Гэты працэс цяпер парушыўся. Яго неабходна адрэгуляваць.

У 1990 годзе, калі праходзіў этап Кубка свету па лыжах, Міжнародная федэрацыя (ФІС) прапанавала раз у два гады праводзіць такія спаборніцтвы ў Раўбічах. Але, відаць, мы не праявілі дастатковых намаганняў для таго, каб гэта прапанова ажыццявілася. Цяпер трэба абавязкова вярнуцца да гэтага пытання. Бо правядзенне буйных спаборніцтваў можа даць добрыя грошы. Ды і комплекс без спаборніцтваў ужо не комплекс...

— Аляксандр Пятровіч, а нестабільнасць у палітыцы і эканоміцы ў нашай рэспубліцы не адпужвае цяпер замежных гасцей?

— Здаецца, не. Комплекс паранейшаму прыцягвае ўвагу. Чаму? Ён стаў больш адкрыты для людзей. Дарэчы, кожны госць з-за мяжы шукае тут свой інтарэс. Я аднойчы ўзяў і перагледзеў «візіткі» чужаземцаў. Атрымалася, што толькі з трыма чалавекамі са ста я падтрымліваю нейкія кантакты.

— Я так зразумеў, што Раўбічы сталі больш «свабоднай зонай» не толькі для дзелавых людзей з-за мяжы, але і для звычайных аматараў спорту?

— Канешне. Для нас, я паўтаруся, усе роўныя. Але за паўтара года работы пераканаўся, што вельмі многія мінчане ні разу тут не былі. У народа ўяўленне, што Раўбічы— гэта толькі лыжы, біятлон. А калі чалавек імі не цікавіцца, дык і комплекс, маўляў, не для яго. Што і казаць, калі нават у многіх кіраўнікоў ён асацыіруецца з нейкай лыжнай базай.

— Дапусцім, народ рэзка пераменіць свае погляды і захоча тут адпачываць?

— Калі ласка. Толькі каб не было ілюзій наконт цэн, хоць яны даволі памяркоўныя. Нас часта абвінавачваюць цяпер у іх непамернасці і скардзяцца, што трапіць у Раўбічы простаму чалавеку нельга. Сцвярджаюць, што з ростам платы за паслугі работнікі атрымліваюць вялікія грошы. Я магу сказаць на гэта, што да вялікіх грошай нам вельмі далёка. Можна было б, канешне, сёння ўзвінціць цану на паслугі, размясціць салідны спартыўны клуб, нацыянальную каманду. Але пераможцамі хадзілі б усяго тыдзень.

— З кім вам падабаецца працаваць больш?

— Найбольшую актыўнасць праяўляюць немцы, італьянцы. Неблагія партнёры і палякі. А наогул, трэба сказаць, што ўсё больш паяўляецца «сваіх» дзелавых людзей.

Зацікаўленасць ідзе па нарастаючай. Як з нашага боку, так і з боку чужаземцаў. Прычым з любым замежным бізнесменам можна весці размову на спартыўную тэматыку, чаго не скажаш пра нашых прадпрымальнікаў. Кіраўнік фірмы з-за мяжы ці сам займаецца спортам, ці яго фірма выпускае спартыўны інвентар. Нашы ж кіраўнікі прадпрыемстваў могуць гаварыць толькі пра сваю сферу дзейнасці.

— Калі ўжо размова зайшла пра бізнес, дык лагічна спытаць: ці збіраецеся культываваць турызм?

— Так. У Аўстрыі, напрыклад, паводле даных часопіса «Деловой мир», дваццаць сем працэнтаў валютных сродкаў паступае ў дзяржаўны бюджэт за кошт турызму.

І краіна, і турызм могуць працвітаць, калі мы зможам наладзіць нашым замежным гасцям добры адпачынак і цёплы прыём.

Гутарыў
Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ПРЭМ'ЕРЫ

«Тры нажы з краіны Вэй»

Зусім нечаканую прэм'еру падрыхтаваў Дзяржаўны рускі тэатр Беларусі пад канец цяперашняга сезона. Першыя гледачы спектакля «Тры нажы з краіны Вэй» маладога рэжысёра Сяргея Астрэнкі сталі сведкамі нараджэння новага віду мастацтва. Гэта не драматычнае дзейства, не балет, не пантаміма, хоць кожнае з гэтых вызначанняў было б тут дарэчы. Невядомае жыццё Кітая VII стагоддзя ўвасобілася ў маляўнічае і чароўнае відовішча, насычанае колерам, гукам і рухам.

П'есу шведскага паэта, празаіка і драматурга, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Хары Марцінсона ажыццявіў на беларускай сцэне рэжысёр-пастаноўшчык, балетмайстар і выканаўца галоўнай мужчынскай ролі Сяргей Астрэнка. Цудоўныя касцюмы да спектакля стварыла Наталля Дудчанка. А малады беларускі кампазітар Віктар Капыцько, вядомы як аўтар нацыянальнай музыкі, паспрабаваў сябе ў музычнай лексіцы Усходу.

НА ЗДЫМКУ: артыстка Таццяна ГАРКУША ў ролі выхаваценя манастыра Шы Мо.

Фота Аркадзя НІКАЛАЕВА. (БЕЛТА).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

5 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

9.00. «Тапёр». 1-я і 2-я серыі.
16.30. Навіны.
16.35. Для дзяцей. Дарожная азбука.
17.00. Фільм-канцэрт.
17.30. «Прыгоды Мюнхгаўзена». «Цудоўны вострaў». «Паўлін». «Трапны страл».
18.00. Тэл. дак. фільмы «Фермеры», «Не развітвайцеся з дзяцінствам».
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Наш каментарый. «Транспартныя пакуты».
19.15. «Любоў яшчэ быць можа...» Тэл. дак. фільм.
19.45. «20 мінут з «Песнярамі».
20.05. Сёння — Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя. Тэлевізійны экалагічны веснік.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. II Рэспубліканскі тэлеконкурс маладых выканаўцаў папулярнай беларускай песні.
23.20. НІКа.
23.35. На шляху да Барселоны. Сяргей Дземяшкевіч. Грэка-рымская барацьба.

I канал. Астанкіна

8.20. «Багатыя таксама плачуць».
8.45. Іграе Маскоўскае трыо.
9.05. «Капрызка».
9.25. «Доктар Тэйран». 3-я серыя.
11.00. Навіны.
11.20. Клуб падарожнікаў.
13.15. Брыдж.
13.40. Бізнес-клас.
13.55. Блакнот.
14.00. Навіны.
14.25. «Падарунак меламану». Іграе Віктар Трацяцякоў.
14.55. «Дуброўскі». 4-я серыя.
16.00. Таленты і паклонніки.
16.50. Мультфільм.
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
17.55. «Эміль з Ленеберга» (Швецыя). 9-я серыя.
18.20. ТБ «Нява». Хто з намі?
18.40. Тэл. дак. фільм «Дзве агляднікі». Пра лёс расійскага сялянства.
19.15. Яраслаўскі фестываль «Жанчына ў тэатры». «Са смехам... комік-група «Уніісон».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. ВІД прадстаўляе: «Поле цудаў», «Музагляд». Праграма «Х». «Палітбюро».
0.40. «Дуброўскі». 4-я серыя

Канал «Расія»

12.10. «Апошні ліст» (ЗША).
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
14.30. Прастора плюс.
15.00. Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Непазнаны Сусвет.
17.45. М-трэст.
18.00. Прашу слова.
18.10. Белая варона.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Пазнаючы белы свет».
20.45. Экран крымінальных паведамленняў.
20.55. Акцыя «Пелікан». Дабрачынны канцэрт.
22.00. Весткі.
22.20. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
22.50. Пецярбургскі міф. Д. Хармс. «Лаві момант». Монаспектакль у выкананні Я. Лукошава.
23.25. Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.

6 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. «Яшма». Кінанарыс.
8.55. Выпускны экзамен па алгебры за курс базавай школы.
9.00. «Вечная раніца аперэты». Фільм-канцэрт.
10.00. Паказвае Гродна. Гарадніца.
11.00. Тыдзень планеты. Міжнародны агляд.
11.15. «Крок» прадстаўляе... Аўстралійскі блакнот.
11.50. Неверагоднае ці забытае ў медыцыне.
12.30. «Усё ў садзе». Спектакль.
15.20. Геракл. Клуб культурыстаў.
16.05. Праграма мультфільмаў.
16.40. Забаўляльная праграма для дзяцей.
17.30. Святкаванне дзён славянскага пісьменства і культуры на Беларусі.
19.00. II Рэспубліканскі тэлеконкурс маладых выканаўцаў папулярнай беларускай песні.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.45. Маст. фільм «Арол ці рэшка» (Францыя).
23.20. НІКа.

I канал. Астанкіна

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Раніцняя гімнастыка.
7.40. Спорт для ўсіх.
8.10. Навукова-папулярны фільм «Музычныя інструменты і іх гісторыя» (Германія). 1-я серыя.
8.40. Як дабіцца поспеху.
9.00. Радыё «Труба». Забаўляльная праграма.
9.30. Цэнтр.
10.10. НЛА: неаб'яўлены візіт.
10.40. Старожкі рускай музыкі С. Рахманінаў. «Алека».
11.10. Медыцына для цябе.
11.50. Кніжны двор.
12.40. «Пчала Мая».
13.05. Дак. фільм «Шпіёнскія гісторыі». 2-я серыя.
14.00. Навіны.
14.20. Маст. фільм «Ліловы шар».
15.50. Чырвоны квадрат.
16.30. У свеце жывёл.
17.10. Шчаслівы выпадак.
18.15. Маст. фільм «Завяшчанне прафесара Доўэля».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Што? Дзе? Калі?
21.40. Да і пасля поўначы.
0.25. «Дзікі пляж». Маст. фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Дакументальная панарама. «Кержацкі кут».
7.40. Фальклор. «Акуліха».
8.00. Баскетбольны агляд НБА.
8.30. Адкрыты свет.
9.15. Прызнанне ў каханні.
9.30. Праграма 03.
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
11.15. Як жыць будзем?
12.00. Размова папросту.
12.30. «Бурда модэн» правінуе...
13.00. Весткі.
13.20. «Зорка чароўнага шчасця». Маст. фільм. 1-я серыя.
14.45. Маладзёжны ансамбль рускіх народных інструментаў «Старая Масква».
15.00. Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.
16.00. «А. С. Пушкін і лёсы рускай культуры». Тэлевізійнае эсэ В. Няпомняшчага.
16.40. Пілігрым.
17.25. Рок-канцэрт. Ансамбль «Брава».
18.10. Парламенцкі веснік.
18.25. Творы А. С. Пушкіна ў выкананні П. Луспякаева, В. Ларыёнава, С. Юрскага.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Музыка ў стылі «пепсі».
21.25. Маскі-шоў.
22.00. Весткі.
22.20. «Выйсці замуж за капітана». Маст. фільм.
23.45. Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.

НА ДВОР'Е

5 чэрвеня

Сёння ўдзень па рэспубліцы ападкаў не чакаецца. Тэмпература ў Віцебску — 19—21, Гомелі, Магілёве — 20—22, Мінску, Гродна — 21—23, Брэсце — 22—24.

У наступныя двое сутак захаваецца сухое і цёплае надвор'е. Сухое надвор'е ўзмацняе пагрозу ўзнікнення пажараў у лясах і на торфяніках. У сувязі з гэтым нагадваем пра асцярожнае абыходжанне з агнём. Не раскладайце вогнішчы ў лясных масівах.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Пасяджэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб дадатковых мерах па сацыяльнай абароне пенсіянераў, інвалідаў і іншых груп насельніцтва».

«Люстэрка». Інфармацыйная панарама.

Крызіс: шляхі пераадолення. «Ці ўпішацца «неразумная маса» ў новую сістэму каардынат?»

Нататкі з нагоды «неявсёлай арыфметыкі» ў настаўнікаў.

І смех і грэх. «Ох ужо гэтае відэа».

Лёсы. «Пад стук колаў».

З апошняй пошты. Падборка пісьмаў.

«У садзе і агародзе».

Чэмпіянаты, кубкі, турніры.

«Кругагляд». Агляд міжнародных падзей.

Фільмы тыдня.

Праграма тэлепередач.

Рэклама.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмны — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 112.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

На крата— з... вудзільнам

У чашай поще зноў шмат сігналаў пра шкодніка-крата. Сёння кожны адчуў небяспеку гэтага «драпежніка». Мала таго, што робіць магістралі ня расліні і пад расліннямі. Ен яшчэ будзе пматаліцця «жылыя» кварталы. Ні карбідам, ні бітым шклом, якое загружаюць у норы, ні аўтамабільнымі газамі, ні вадой — нішым не «выкурыць» падземнага жыхара.

У пасткі не ідзе, нават тыя, якія пастаўлены памайстэрску: у розных напрамках і старанна прысыпаны без пашкоджання ходу. Быццам які лакатар у звярка: перад пасткай робіць кульбіт убок, абходзіць небяспеку і зноў па трасе.

Тым больш нечаканым быў нядаўні званок у рэдакцыю. Чалавек не назваў сябе, як сказаў, яму няёмка за сваё «вынаходства».

А сутнасць яго вось у чым. Супраць крата — вудзільна. Самае звычайнае. Кручкі невялікія — як на плотку, калёныя. Лёска — 0,4. На адно «вудзільна» (кароткі павадок да 40 см) ладзяцца два кручкі, на іх нажыўляецца адзін чырвоны балзёры чарвяк. Джала хаваецца. Нажыўка кладзецца ў нару (рукі «рыбака», а значыць і чарвяк нічым акрамя зямлі не пахнуць!). «Жывец» на вудачцы паводзіць сябе прыстойна, не залазіць у зямлю. Ну а драпежнік, што той шчупак, хапае рашуча і надзейна.

Такому расказу, як, упэўнены, і большасць чытачоў, не паверыў.

— А як з паплавочкам? — спытаў у субяседніка. — Ці не ўплывае паўночны вецер?

— Ну вось, вы яшчэ спытаеце: а ці ёсць у крата стопсігнал, указальнікі паваротаў, — пакрыўдзіліся на тым канцы провада.

— Так проста: нажывіў чарвяка і маеш крата, — прыйшлося адразу перайсці на памяркоўны тон.

— Не, я доўга вывучаў «псіхалогію» драпежніка, падкормліваў яго. Вось калі ўзяў прыкорм (слабых чарвякоў, кавалачкі мяса), тады і пайшло ў ход вудзільна. У мяне на агародзе ўжо няма паклёўкі. Вылавіў усіх. «Рыбачу» ў лесе і на лузе, спрабую закінуць вудачку ў суседнія агароды. Пакуль па-партызанску, непрыкметна...

Можа хто з нашых чытачоў таксама захоча «паспрабаваць рыбацкага шчасця»? Аб выніках напішыце.

І плашч, і ручнік

Хлопчыку ці дзяўчынцы на пляжы спатрэбіцца плашчык, які можна пашыць з махровага ручніка ці прасціны. Ён і сагрэе, і ад сонца ўкрые, і выцірацца зручна, і паляжаць на ім можна.

Трэба ўзяць квадрат тканіны, у адным з вуглоў зрабіць кішэню, якая служыць капюшонам, у двух іншых — прораз і для рук. Краі і прораз абшыйце шырокай тасьмой — вось і ўсё.

Блузка— ГЭТА КЛАСІЧНЫ, УНІВЕРСАЛЬНЫ ЭЛЕМЕНТ ГАРДЭРОБА ЖАНЧЫНЫ

Вы — маладая, сярэдняга ўзросту, ці жанчына паважаных гадоў — у гардэробе кожнай да месца такая форма адзення, як блузка. Да твару падабраная па колеру, спрытна пашытая па вашай фігуры, з густам аздобленая блузка ўпрыгожыць вас, надасць урачыстасць і элегантнасць вашаму знешняму выгляду. Блузка — зручнае адзенне ў любы момант вашага жыцця. А наяўнасць у вашым гардэробе некалькіх розных мадэляў блузак дасць вам магчымасць заўсёды выглядаць па-новаму прыгожа. Раім вам папоўніць ваш гардэроб новымі іх фасонамі. І пашыйце іх самі. Гэта дазволіць вам унесці ў аздабленне блузкі нейкі свой, можа нават нечаканы элемент. Фантазія ж у жанчын вельмі багатая. І ў кожнай свая. Паспрабуйце быць арыгінальнай.





А мы прапануем вам мадэль блузкі з шаўковай тканіны. Яе асаблівасці—цэнтральная бартавая засцежка на планцы. Рукаў уточаны, прысабраны па акату і ўнізе. Аздоблена блузка косымі валанамі, размешчанымі на полачках адзін пад адным. Паменшаная выкрайка гэтай мадэлі даецца на размер 164—96—104. На такую блузку вам спатрэбіцца 2 м 60 см тканіны, калі яе шырыня 90 см.

ЗААПАРК У КВАТЭРЫ

Папугаі: утрыманне

Дома гэтых птушак лепш за ўсё ўтрымліваць у клетках, якія ёсць у продажы ў заамагазінах і на птушыных рынках. Для большасці папугаяў найбольш прыдатныя толькі металічныя клеткі. Яны больш гігіенічныя і даўгавечныя, чым зробленыя з дрэва і металічных прутоў. Не трэба браць клеткі з меднага дроту, які з часам пакрыецца вокісам і дрэнна адаб'ецца на здароўі птушак. Прасачыце пры пакупцы, каб усё было зроблена акуратна і чыста, інакш папугай можа зачапіцца кіпцюром ці ўшчаміцца лапай між прутоў.

Клеткі павінны быць як мага большымі, з высокімі борцікамі, каб папугаі не раскідвалі ежу, пясок і смецце. Для дробных і сярэдніх папугаяў (лоры, німфы, хвалістыя, неразлучныя) — прамавугольныя (70×60×50 см, 100×70×50 см і больш), а для буйных— квадратныя ці круглыя (80×60×60 см і 100×70×70 см).

У кожнай клетцы абавязкова павінна быць кармушка, паілка, шклянка для мінеральнай ежы і некалькі жэрдачак. Калі заўважылі, што папугай любіць купацца, падвесце спецыяльную купальню з вадой пакаёвай тэмпературы.

Таўшчыня жэрдачкі павінна быць такой, каб пальцы папугая не сыходзіліся, калі ён на ёй сядзіць. Інакш яму нязручна будзе сядзець, а акрамя таго, кіпцюрамі ён можа параніць сабе лапу.

На дно клеткі, якое высоўва